ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»

# Мемарыяльныя віртуальныя музеі на сайтах бібліятэк

## Метадычныя рэкамендацыі

Минск
2024

УДК 021.4

ББК 79.147.19(4Беі) + 78.349.5

М49

Мемарыяльныя віртуальныя музеі на сайтах бібліятэк : метадычныя рэкамендацыі / ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна», Аддзел бібліятэказнаўства ; склад., рэд.: Т. А. Лаўрык. – Мінск, 2024. – 93 с.

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА .......... 4

Віртуальныя праекты і выстаўкі: ад ідэі да новых форм папулярызацыі (з вопыту працы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) .......... 5

«Віртуальны музей Міхася Скрыпкі» .......... 12

«Виртуальный музей борисовского поэта Леонида Рашковского» .......... 16

Виртуальный музей «Синявский Иван Иванович – белорусский педагог, писатель» .......... 20

«Віртуальны музей Кузьмы Чорнага» .......... 29

«Васіль Васільевіч Зуёнак: віртуальны кабінет» .......... 36

«Віртуальны музей народнага паэта Беларусі Ніла Сымонавіча Гілевіча» .......... 39

«Віртуальны музей Язэпа Пушчы» .......... 41

«Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча» .......... 47

Віртуальны музей Васіля Віткі «Народжаны пад знакам паэзіі» .......... 51

«Віртуальны літаратурны музей Міколы Нікановіча» .......... 58

«Гуринович Фёдор Фёдорович: виртуальный кабинет писателя-земляка» .......... 63

Віртуальная старонка пра паэта, празаіка і публіцыста Міхася Парахневіча .......... 68

«Віртуальны музей Паўлюка Труса» .......... 71

«Віртуальны музей Максіма Багдановіча» .......... 75

ПАЛАЖЭННЕ аб правядзенні абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага музея на сайце бібліятэкі .......... 80

РАШЭННЕ пасяджэння сяброў журы .......... 87

Спіс рэкамендаванай літаратуры .......... 90

# ПРАДМОВА

*З верасня 2022 года па снежань 2023 года ў Мінскай вобласці намаганнямі публічных бібліятэк рэалізоўваўся абласны літаратурна-краязнаўчы праект «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю», які завяршыўся падвядзеннем вынікаў абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу (віртуальнага музея, кабінета ці старонкі) пра пісьменніка-земляка на афіцыйных сайтах бібліятэк.*

*Такая форма праектнай дзейнасці на сённяшні дзень вельмі запатрабавальная сярод буйных бібліятэчных сетак. Яна спрыяе не толькі рэалізацыі краязнаўчай дзейнасці, але і дазваляе палепшыць імідж і рэйтынг афіцыйнага рэсурсу ўстановы, павялічыць колькасць віртуальных наведванняў бібліятэчнага сайту.*

*Стварэнне віртуальнага музея, кабінета ці старонкі пісьменніка патрабуе збору матэрыялаў, кантактавання з музеямі і архівамі краіны; для падачы матэрыялу ў інтэрнэт-прасторы – выканання пэўных патрабаванняў і, у першую чаргу, магчымасці ажыццяўлення такой працы сіламі супрацоўнікаў бібліятэкі.*

*У зборніку прадстаўлены матэрыялы, якія знаёмяць з віртуальнымі рэсурсамі, створанымі на сайтах публічных бібліятэк Мінскай вобласці ў 2023 годзе ў рамках дадзенага праекта, размешчана палажэнне аб конкурсе і яго вынікі, падведзеныя рашэннем журы ад 12.12.2023. Спіс рэкамендаванай літаратуры дапаможа вызначыцца ў пытаннях стварэння інфармацыйнага рэсурсу, прысвечанага вядомай асобе вашага рэгіёну, на сайце бібліятэкі і папулярызацыі гэтага праекту.*

# Віртуальныя праекты і выстаўкі: ад ідэі да новых форм папулярызацыі (з вопыту працы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі)

*Лаўрык Тацяна Анатольеўна,* *загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»*

Адзін з накірункаў працы любой публічнай бібліятэкі – стварэнне віртуальных выставак, на сёння вельмі перспектыўнай з'яўляецца праца па рэалізацыі віртуальных рэсурсаў, якія знаёмяць наведвальнікаў з этапамі станаўлення нацыянальнай культуры і значнымі падзеямі ў гісторыі краіны.

Віртуальная выстаўка – публічная дэманстрацыя ў сетцы Інтэрнэт з дапамогай сродкаў вэб-тэхналогій віртуальных вобразаў спецыяльна падабраных і сістэматызаваных твораў друку і іншых носьбітаў інфармацыі, а таксама агульнадаступных электронных рэсурсаў, рэкамендуемых аддаленым карыстальнікам бібліятэкі для агляду, азнаямлення і выкарыстання. Часам яны з'яўляюцца адлюстраваннем кніжнай выстаўкі ў віртуальнай прасторы, аднак даступны не толькі ў межах установы, але і за яе сценамі. У бібліятэчнай практыцы ўпершыню пачалі выкарыстоўвацца ў навуковых бібліятэках і бібліятэках навучальных установ.

Вартасці віртуальных выставак:

дынамічнасць і маляўнічасць – выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій робіць іх жывымі, яркімі, па магчымасці, абсталяванымі агучаным тэкстам, што і прываблівае чытачоў;

даступнасць да выставак з любога аддаленага камп'ютэрнага месца;

масавасць – можа быць прадстаўлена вялікая колькасць матэрыялаў;

эканамічнасць – такія выстаўкі эканомяць месца, бо можна прадставіць большую колькасць кніг, не займаючы рэальнай прасторы бібліятэкі, няма неабходнасці працаваць са стэлажамі, стэндамі, выставачнымі шафамі;

мабільнасць – могуць выкарыстоўвацца як выязныя, зручна дэманстраваць ў розных адукацыйных установах, аўдыторыях, кабінетах, класах;

захаванасць кніжных фондаў – можна працаваць з рэдкімі выданнямі ў любы зручны для карыстальніка час, без рызыкі іх згубіць;

доўгатэрміновасць – могуць функцыянаваць доўгі час.

Варта ўлічваць пэўныя **патрабаванні да стварэння віртуальнай выстаўкі**:

неабходна дастатковае месца на сайце бібліятэкі, а тэхнічнае забеспячэнне павінна дазваляць размясціць аб'ёмны матэрыял;

стваральнікі выстаўкі павінны валодаць камп'ютарнымі ўменнямі і мастацкім густам;

важны выбар прывабнай афішы, якая перадае ідэю выстаўкі;

размяшчаць неабходна не проста падбор кніг аўтара, але і інфармацыю пра саму асобу, якой прысвечана выстаўка. Да стварэння такіх раздзелаў варта далучаць розных спецыялістаў: гісторыкаў, філолагаў, літаратуразнаўцаў;

уключаць выявы, фотаздымкі, ілюстрацыйны матэрыял з магчымасцю яго капіравання, што робіць выстаўку яшчэ больш каштоўнай.

Новай формай працы бібліятэк сталі віртуальныя праекты, якія з'яўляюцца сучаснымі інфармацыйнымі прадуктамі, з часам могуць скласці важную частку нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, якія ствараюцца ў фармаце HTML.

Існуюць **3 асноўныя варыянты рэалізацыі праектаў**:

стварэнне асобнай рубрыкі навін з падборкай артыкулаў па абранай тэматыцы;

віртуальны праект на сайце;

стварэнне асобнага рэсурсу з далейшым размяшчэннем на ім інфармацыі.

Прааналізуем працу ў гэтым накірунку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Першай формай віртуальных праектаў на партале бібліятэкі былі прадстаўлены рэсурсы «Газетная эпоха: старонкі часу», «Сведкі эпохі: Беларусь на старонках газет 100-гадовай даўніны», «100 дзён да Вялікай Перамогі. Па старонках беларускіх газет 1945 г.» і іншыя. У навінавым раздзеле партала ствараецца спецыяльная рубрыка, а пры адкрыцці старонкі навін можна атрымаць падборку тэматычнай інфармацыі рэсурсу.

Віртуальныя праекты на партале – найбольш традыцыйная форма, такіх рэсурсаў створана найбольш. Першы віртуальны праект «Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас» быў размешчаны на сайце бібліятэкі ў 2012 г. Асабліва могуць зацікавіць рэсурсы: «1812 год у гісторыі Беларусі», «Беларусь у Першай сусветнай», выстаўка «Языком власным права списанные маем»: да 430-годдзя Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. У 2019 г., багатым на гучныя міжнародныя мерапрыемствы, былі падрыхтаваны праекты «Юнеска і Беларусь: вехі супрацоўніцтва»: да 65-годдзя ўступлення Беларусі ў ЮНЕСКА (1954–2019), «Еўрапейскія гульні 2019: 15 яркіх акцэнтаў»: да II Еўрапейскіх гульняў, «Станіслаў Манюшка. Музычны рамантык з Міншчыны»: да 200-годдзя з дня нараджэння.

У некаторых выпадках, калі аб'ём і структура інфармацыі выходзіць па-за рамкі магчымасцей падсістэмы віртуальных праектаў, выкарыстоўваецца асобны рэсурс. У гэтай якасці ўжываецца, у прыватнасці, платформа Omeka, створаная адмыслова для прадстаўлення лічбавых калекцый (БД «Кніга Беларусі XIV-XVIII стагоддзяў», «Мода і час» («Лічбавы калейдаскоп НББ»), праект-сайт «Падпольны і партызанскі друк Беларусі»). Калі праект унікальны і не ўкладаецца ў тыповы функцыянал, прадстаўлены той ці іншай платформай, далучаюць іншага

распрацоўшчыка. Яго стварэнне займае ад 0,5 да 2 гадоў (сайты-праекты «Беларусь у інфармацыйнай прасторы», «Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў», анлайн-энцыклапедыя «Беларусь у асобах і падзеях», Дзяржаўны інфармацыйны рэсурс «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь» і іншыя.

У якасці ідэй пры стварэнні віртуальнага праекта могуць быць выкарыстаны:

1. Знамянальныя даты ў жыцці краіны.

2. Свецкія і рэлігійныя святы, гістарычныя даты, звязаныя з малой Радзімай.

3. Юбілеі выдатных дзеячоў культуры і мастацтва Беларусі.

4. Памятныя даты календара ЮНЕСКА.

Таксама ў якасці асновы для віртуальнага рэсурсу могуць паслужыць тэматычныя выстаўкі і маштабныя праекты, якія апярэджваюць падзею і становяцца падрыхтоўкай да святкавання юбілейнай даты.

Для стварэння віртуальнага праекта патрабуецца сумесная праца некалькіх падраздзяленняў бібліятэкі ці асобных арганізацый. Адзін са спецыялізаваных інфармацыйных аддзелаў бібліятэкі рыхтуе падборку неабходных тэкстаў, ілюстрацый, аўдыё- і відэаматэрыялаў і іншае. Да дыгіталізацыі тэкстаў і падрыхтоўкі аўтарскіх дамоваў для публікацыі тэкстаў сучасных аўтараў далучаецца аддзел фарміравання электроннай бібліятэкі. Падрыхтаваная інфармацыя перадаецца ў аддзел суправаджэння інтэрнэт-партала, дзе яна праходзіць працэс рэдагавання, перакладу на рускую і англійскую мовы, тэхнічнай апрацоўкі і візуалізацыі.

Адна з мэт, якую праследуюць віртуальныя праекты Нацыянальнай бібліятэкі, – адкрыць доступ карыстальнікам да паўнатэкставых крыніц, якія можна спампаваць, таксама матэрыялаў з фондаў бібліятэкі і іншых арганізацый, якія становяцца партнёрамі пры стварэнні гэтага рэсурсу. Асобныя праекты застаюцца закансерваванымі на сайце бібліятэкі, некаторыя папаўняюцца новымі дакументамі пры стварэнні новых раздзелаў. Напрыклад, праект «Беларусь у Першай сусветнай» быў падрыхтаваны да 100-годдзя вайны, але пры святкаванні ў 2018 г. 100-годдзя яе заканчэння быў створаны новы раздзел «Палкаводцы і ваеначальнікі Першай сусветнай – ураджэнцы Беларусі». Прайшла прэзентацыя гэтага раздзела, што наноў прыцягнула ўвагу да ўжо створанага праекта.

Практыкуюцца наступныя **формы папулярызацыі віртуальнага праекта** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі:

інфармацыя на інтэрнэт-партале ў стужцы навін бібліятэкі пасля размяшчэння ўсяго матэрыяла;

прэзентацыя праекта на бібліятэчным мерапрыемстве;

выступленне з яго папулярызацыяй на навуковай канферэнцыі (часцей гэта бібліятэчныя канферэнцыі) ці ў спецыялізаваным бібліятэчным друку;

рассылка прэс-рэліза для СМІ з мэтай азнакамлення з новымі прадуктамі бібліятэкі.

Некаторыя з віртуальных праектаў у бібліятэцы застаюцца без увагі карыстальнікаў, бо яны актуальны і цікавы вельмі кароткі час, нягледзячы на прыкладзеныя намаганні па іх стварэнні. Таму ўстае пытанне, якія яшчэ формы іх папулярызацыі могуць выкарыстоўвацца?

Плённай бачыцца арганізацыя сумеснай праектнай дзейнасці з тымі ўстановамі, якія зацікаўлены ў атрыманні вынікаў і для сябе. Такая праца робіць рэсурс больш каштоўным і спрыяе кваліфікаванаму падыходу да пададзенай інфармацыі.

Спынімся на маштабным віртуальным праекце «На хвалі часу, у плыні жыцця», прымеркаваным да 100-годдзя Усебеларускага літаратурнага аб’яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк», які быў разлічаны на доўгі перыяд часу (2019–2023). Праца па яго рэалізацыі ажыццяўлялася пры ўдзеле чатырох устаноў: Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Выдавецкага дома «Звязда». 14 сакавіка 2019 г. на сумесным мерапрыемстве на пляцоўцы Музея гісторыі беларускай літаратуры, прысвечаным адкрыццю праекта і святкаванню 110-годдзю Валерыя Маракова, быў пакладзены пачатак і падпісана дамова, якая зацвердзіла гэту дату 14 сакавіка як пачатак сумеснай дзейнасці ў стварэнні і папулярызацыі творчасці літаб’яднання «Маладняк» і яе сяброў. Пачатак сумеснай дзейнасці выклікаў увагу ў СМІ, зацікавілася Беларускае радыё, дзе ў прамым эфіры канала «Культура» пазней праходзілі сустрэчы з ўдзельнікамі Праекта чатырох ад кожнай установы.

**Падчас працы над праектам рэалізоўваліся наступныя працэсы:**

1. Падрыхтоўка і заключэнне дагавара аб супрацоўніцтве.

2. Да працы над праектам, прымеркаваным да 100-годдзя ўтварэння літаб’яднання «Маладняк», прыцягвалі спецыялістаў, якія дапамагалі кваліфікавана падысці да збору інфармацыі. Далучаліся навукоўцы, занятыя ў гэтай тэме: спецыялісты з філалагічнай адукацыяй, архівісты.

3. Наладжваліся сувязі з іншымі ўстановамі і СМІ для папулярызацыі праектнай дзейнасці, што спрыяла з’яўленню новых форм папулярызацыі. Сувязь з грамадскасцю, падтрымка СМІ у працэсе рэалізацыі праекта дазваляла перадаць кожны крок праекта, зрабіць яго даступным для грамадскасці. Гэта забяспечвала адкрытасць навуковай дзейнасці бібліятэкі для карыстальнікаў.

4. Арганізацыя кантролю, тэрмінаў і графіка выканання працы па праектнай дзейнасці.

5. Вызначэнне і рэалізацыя розных форм папулярызацыі праекта, зацверджаных у дагаворы, які быў заключаны паміж установамі.

Асноўная мэта праекта – размяшчэнне паўнатэкставых дакументаў літаратурнага аб’яднання «Маладняк», выстаўленне для карыстання ў адкрытым доступе прыжыццёвых кніг членаў гэтага аб’яднання (у поўным

аб’ёме кнігі да 1938 г.). Такім чынам, былі прадстаўлены ў адкрытым доступе ў межах праекта паўнатэкставыя часопісы і альманахі «Маладняка», дакументальная літаратура пра дзейнасць згуртавання. У межах праекта ішла праца над стварэннем серыі віртуальных раздзелаў пра пісьменнікаў-юбіляраў, якія з’яўляліся сябрамі літаратурнага аб’яднання.

Размешчана **12 віртуальных раздзелаў** да юбілеяў пісьменнікаў:

да 110-годдзя з дня нараджэння Валерыя Маракова (1909–1937);

да 120-годдзя з дня нараджэння Адама Бабарэкі (1899–1938);

да 115-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Хадыкі (1905–1940);

да 120-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага (1900–1944);

да 120-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Дубоўкі (1900/1901–1976);

да 115-годдзя з дня нараджэння Янкі Скрыгана (1905–1992);

да 115-годдзя з дня нараджэння Андрэя Александровіча (1906-1963);

да 135-годдзя з дня нараджэння Змітрака Бядулі (1886–1941);

да 120 годдзя з дня нараджэння Міхася Зарэцкага (1901–1937);

да 130 годдзя з дня нараджэння Алеся Гурло (1892–1938);

да 120-годдзя з дня нараджэння Язэпа Пушчы (1902–1964);

да 115-годдзя з дня нараджэння Яўгеніі Пфляўмбаўм (1908–1996).

Вялася праца над падпісаннем аўтарскіх дагавароў з даследчыкамі, якія дазваляюць размясціць свае крытычныя даследаванні ў поўным аб’ёме ў межах праекта. Яны далучаюцца і да мерапрыемстваў, падрыхтоўкі тэкставых і выяўленчых матэрыялаў у падраздзелах рэсурсу, стварэнні навін для папулярызацыі гэтай працы.

Цікавасць выклікаюць фотагалерэі і раздзелы ўшанавання памяці пісьменнікаў, якія ствараліся бібліятэкай не без дапамогі партнёраў. Сюды ўключаліся фотаздымкі, дакументы, якія захоўваюцца ў архіве-музеі і музеі гісторыі беларускай літаратуры, а таксама ў фондах іншых арганізацый, якія зацікаўлены ў папулярызацыі асобных беларускіх аўтараў. Тут можна пазнаёміцца са шматлікімі арыгінальнымі дакументамі, якія алічбаваны ўпершыню і даступны для спампоўкі. Каштоўным дадаткам для карыстальнікаў з’яўляецца выверания роспіс фатаграфій з указаннем месцазнаходжання дакумента, што аблягчае зварот даследчыкаў да архіваў пісьменнікаў. Амаль адначасова з падрыхтоўкай раздзела да юбілея кожнага аўтара з 2019 па сярэдзіну 2021 гадоў рыхтаваліся артыкулы для часопіса «Маладосць». Пад рубрыкай праекта амаль кожны месяц на працягу гэтых гадоў сумеснай дзейнасці выходзілі артыкулы, прасвечаныя «Маладняку» і яго сябрам-юбілярам.

Пры рэалізацыі такой праектнай дзейнасці былі выкарыстаны **наступныя формы папулярызацыі**:

1. Размяшчэнне навукова-папулярных артыкулаў у перыядычным друку.

У часопісе «Маладосць» пад рубрыкай праекта размяшчаліся артыкулы да юбілеяў пісьменнікаў-маладнякоўцаў, інфармацыя пра

мерапрыемствы адлюстроўвалася на старонках газет «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «СБ: Беларусь сегодня», «Краязнаўчая газета».

2. Навіны на сайтах удзельнікаў праекта.

Інфармацыю пра ўсе крокі праекта рыхтавала Нацыянальная бібліятэка, у абавязковым парадку часопіс «Маладосць» (да чэрвеня 2021 года) размяшчаў яе на сваім і на сайтах партнёраў, у рэсурсах музей гісторыі беларускай літаратуры, архіў-музей літаратуры і мастацтва.

3. Вечарыны, імпрэзы, прысвечаныя юбілеям пісьменнікаў.

На пляцоўках Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і яго філіяла Літаратурны музей Кузьмы Чорнага, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзілі вечарыны, прысвечаныя юбілярам-выхадцам з «Маладняка», на якіх прэзентаваліся раздзелы віртуальнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця».

4. Адкрытыя лекцыі.

5. Круглыя сталы, семінары, канферэнцыі.

Арганізоўваліся навукова-практычныя семінары, круглыя сталы, канферэнцыі ў рамках праекта Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва.

6. Лекцыі для студэнтаў і слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі.

У тым ліку, праца праекта папулярызавалася на бібліятэчных канферэнцыях, для глыбокага даследавання творчасці пісьменнікаў-«маладнякоўцаў» быў выкарыстаны ўдзел у навукова-даследчай рабоце «Распрацаваць інфармацыйны рэсурс "Фарміраванне культуры Беларусі найноўшага часу праз адлюстраванне айчынных газет 1917–1922 гг."», якая рэалізоўвалася Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў 2019 г. Прагляд газет адзначанага перыяду дазволіў прасачыць, як сталелі тыя, хто ўвайшоў у склад Усебеларускага літаратурнага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк».

У свой час, пандэмія перапыніла многія планы рэалізацыі новых форм далейшай папулярызацыі праекта, але гэта спрыяла выхаду праекта ў анлайн-прастору і правядзенні круглых сталоў, семінараў у жывым эфіры на YouTube-канале, падрыхтоўцы ролікаў пра праектную дзейнасць. Таксама гэта спрыяла рэалізацыі рэспубліканскіх анлайн-конкурсаў чытальнікаў «О, Беларусь, мая шыпшына», да 120-годдзя У. Дубоўкі ў 2020 годзе і літаратурнага анлайн-конкурсу «Беларускі салавей», да 135-годдзя Змітрака Бядулі ў 2021 годзе.

Цікавасць з боку карыстальнікаў да такіх бібліятэчных рэсурсаў гаворыць пра іх запатрабаванасць.

*Матэрыял ўяўляе пашыраную і дапоўненую версію артыкула, апублікаванага ў навуковым зборніку «Бібліятэчны веснік», вып. 12 за 2020 год.*

**Спіс рэкамендаванай літаратуры для знаёмства з праектам:**


1. Лаўрык, Т. «Знаем – намі пройдзеных пуцін не забыць, ня зьнішчыць, не закрэсьліць…» / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2019. – № 2. – С. 93–97.
2. Лаўрык, Т. «Мужна жыў і мужна паміраў» : да 110-годдзя Валерыя Маракова / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2019. – № 3. – С. 114–117.
3. Лаўрык, Т. «Маладнякоўскі» Бялінскі : да 120-годдзя Адама Антонавіча Бабарэкі / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2019. – № 8. – С. 34–39.
4. Лаўрык, Т. «Мы зарунелі на беларускіх загонах» : раннія творы маладнякоўцаў у беларускіх газетах 1917–1922 гг. / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2019. – № 9. – С. 94–100.
5. «Маладнякоўскімі крокамі» : выстава пад такой назвай адкрылася 16 студзеня 2020 г. ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі // Беларус. гіст. часоп. – 2020. – № 1. – С. 31–32.
6. Лаўрык, Т. «Я пакінуў у дарозе многа…»: да 115-годдзя Уладзіміра Марцінавіча Хадыкі / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2020. – № 1. – С. 59–62.
7. Лаўрык, Т. Багаты і бедны / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2020. – № 7. – С. 74–76.
8. Лаўрык, Т. Душа адраджаецца ў сэрцах родных і блізкіх: да 115-годдзя з дня нараджэння Яна Скрыгана / Т. Лаўрык // Маладосць. – 2020. – № 11. – С. 100–104.
9. Лаўрык Т. Хто аўтар верша «Маці – Беларусі» / Т. Лаўрык // Літ. і мастацтва. – 2022. – 20 мая. – С. 11.
10. Лаўрык, Т. Постаці «маладнякоўцаў» на старонках віртуальнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця»: Уладзімір Дубоўка, Кузьма Чорны, Янка Скрыган, Змітрок Бядуля / Т. Лаўрык // Аўтограф : альманах : заснаваны ў 2020 годзе / Беларус. дзярж. архіў-музей літ. і маст. ; [аўтар праекта і ўклад. Г. В. Запартыка ; навук. рэд. В. В. Жыбуль]. – Мінск, 2022. – Вып. 3. – С. 5–9.
11. Лаўрык, Т. Да 135-годдзя з дня нараджэння Змітрака Бядулі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі / Т. Лаўрык // Родн. слова. – 2022. – № 5. – С. 4–5.
12. Лаўрык, Т. На радзіме Яна Скрыгана / Т. Лаўрык // Краязн. газета. – 2022. – № 42 (кастр.) – С. 3.
13. Лаўрык, Т. Памяць пра Яна Скрыгана / Т. Лаўрык // Краязн. газета. – 2023. – № 45 (снеж.). – С. 4.

## «Віртуальны музей Міхася Скрыпкі»

***Багадзяж Вікторыя Вацлаваўна,*** *метадыст аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка»*

Электронны рэсурс змяшчае інфармацыю аб жыцці і творчай дзейнасці Міхася Скрыпкі, папулярызацыі яго творчасці.

Перайсці ў музей можна праз укладку «Краязнаўства» на афіцыйным сайце ДУК «Брэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» https://berezinolib.by/

Матэрыялы для музея прадстаўлены Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, таксама выкарыстоўваліся матэрыялы ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка». Віртуальны музей налічвае 9 раздзелаў, якія аформлены ў адзіным стылі. На галоўнай старонцы змяшчаюцца іх назвы і партрэт пісьменніка. У якасці пераходаў выступаюць назвы раздзелаў з кропкамі «подробнее».




У першым **раздзеле «Жыццёвы і творчы шлях Міхася Скрыпкі»** прадстаўлены матэрыял аб жыцці і творчасці пісьменніка-сатырыка. Пісаць наш зямляк пачаў яшчэ ў школьныя гады. Яго першым творам стала сатырычная камедыя «Штукары», пастаўленая на школьнай сцэне сіламі гурткоўцаў. Першыя друкаваныя творы выйшлі ў Рагачоўскай газеце «Камунар» у перыяд з 1939 па 1941 гады, але менавіта ў пасляваенныя гады Міхаіл Аляксандравіч сур’ёзна заняўся літаратурнай творчасцю і праявіў свой шматгранны талент. Ён аўтар сатырычных вершаў, баек, шаржаў, з’яўляецца аўтарам звыш трыццаці аднаактавых п’ес і камедый для мастацкай самадзейнасці. Не абышоў увагай пісьменнік

і дзяцей. Маленькім чытачам адрасавана кніга апавяданняў «Дзіва ў рэшаце» і зборнік вершаў «Пад смешнай вясёлкай».

Міхась Скрыпка выдаў зборнікі баек, вершаў, мініяцюр: «Сатыра і гумар», «Сатырычны калаўрот», «Ад смеху не ўцячэш», кніжку антырэлігійных нарысаў «Сцеражыцеся цемрашалаў!», «Дзіва ў кошыку», «Злазьце – прыехалі!», «З сэрцам і перцам». Сатыра і гумар паэта накіраваны супраць тых, хто нячысты на руку, хто жыве не па законах. Ён паказвае розныя заганы ў характарах людзей праз павелічальнае шкло гратэска, выстаўляючы іх на ўсеагульнае абсмейванне. Скрыпка нібы абяззбройвае зло і ўсталёўвае тыя высокія ідэалы, на якіх павінны выхоўвацца сучаснікі. У 1963 г. была пастаўлена кароткаметражная тэлекамедыя «Акадэмік», сцэнарый да якой напісаў Міхась Скрыпка. Вядомы ён і як перакладчык вершаў рускіх і ўкраінскіх паэтаў на беларускую мову, і як паэт-песеннік. Скрыпка з’яўляецца перакладчыкам асобных вершаў А. Твардоўскага, С. Маршака, С. Міхалкова, А. Барто, С. Алейніка, А. Вішні, П. Глазавога і інш. На яго словы пісалі песні кампазітары М. Кузняцоў, М. Чуркін.

Раздзел **«Свайму народу дар сатыры»** ўключае алічбаваную кніжку пісьменніка «Злазьце, прыехалі» і вершы пісьменніка.

Трэці раздзел **«Лісты і ўспаміны»**. Тут размешчаны: лісты М. Скрыпкі да пісьменніка Рыгора Няхая, таксама ўраджэнца Бярэзіншчыны; віншавальная паштоўка да Івана Шамякіна; ліст да Ярашэвіч Марыі Якаўлеўны наконт успамінаў пра Еўдакію Лось і самі ўспаміны.

Чацверты раздзел **«З архіва Міхася Скрыпкі»** складаецца з чатырох падраздзелаў. У першым падраздзеле ***«Рукапісы»*** можна знайсці рукапісы твораў Скрыпкі: «Не тая літара»: камедыя ў адной дзеі і «Думка ўслых пра перакладчыка Семяжона», а таксама ўступны маналог М. Скрыпкі і М. Шышкіна з выпраўленнямі аўтараў.

Другі падраздзел ***«Фотаздымкі»***. Тут размешчаны фотаздымак самога пісьменніка і два калектыўныя фотаздымкі, зробленыя падчас выступлення Г. Бураўкіна, М. Скрыпкі, С. Грахоўскага, А. Налівайкі і І. Пятровіча ў Мінскім педінстытуце.

У наступны падраздзел ***«Прадметы, звязаныя з М. Скрыпкай»*** уключаны вокладка часопіса «Вожык», фота членскага білета Саюза пісьменнікаў СССР, копія пісьма даручніка па г.Рагачову З. Кіслякова ў






праўленне

Белдрамтаварыства з просьбай разгледзець на рэдакцыйнай камісіі драму М. Скрыпкі «Гарац агні», пісьмо дзяржаўнага выдавецтва Беларусі ў Белдрамтаварыства аб перасылцы рукапісу М. Скрыпкі «Гарац агні».

Апошні падраздзел **«Вокладкі кніг Міхася Скрыпкі»** ўключае тры сканы вокладак кніг пісьменніка, якія знаходзяцца ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

У раздзеле **«Аўтограф – знак сяброўства»** можна азнаёміцца з аўтографамі пісьменніка, у тым ліку, пакінутыя ім падчас выступленняў на Бярэзіншчыне на кнігах з фонду Бярэзінскай цэнтральнай бібліятэкі.







У раздзеле **«Пісьменнік і бібліятэка»** прадстаўлены кнігі Міхася Скрыпкі, якія знаходзяцца ў фондзе ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка».

Раздзел **«Шаржы»** ўключае шаржы на Міхася Скрыпку.

Раздзел **«Шлях насустрач чытачам»**. Папулярызацыя творчасці Міхася Скрыпкі адбываецца на разнастайных мерапрыемствах, якія праводзяцца бібліятэкамі раёна да дня нараджэння пісьменніка і да дня гумару. Мерапрыемствы знаёмяць удзельнікаў з жыццёвым і творчым шляхам Міхася Скрыпкі, чытаюцца яго вершы, гумарэскі, спяваюцца гумарыстычныя прыпеўкі, удзельнікі дзеляцца і сваімі творчымі напрацоўкамі. Так, да 115-годдзя пісьменніка прайшоў фестываль гумару «Месцячковыя забавы», на якім сабраліся прыхільнікі творчасці Скрыпкі, мясцовая інтэлігенцыя, бібліятэкары. У кожнай бібліятэцы ёсць невялікія літаратурныя палічкі, на якіх размешчана інфармацыя пра нашых пісьменнікаў-землякоў, у тым ліку, і пра Міхася Скрыпку. Быў распрацаваны раенны бібліятэчны праект «Літаратура з правінцыяльнай прапіскай», мэтай якога з'яўляецца прапаганда творчасці пісьменнікаў-землякоў, развіцце пачуцця любові да малой радзімы. Штогод у лістападзе да дня нараджэння М.Скрыпкі ў рамках праекта ладзяцца месячнікі «Літаратурнае краязнаўства ў асобах» з анлайн-чытаннямі твораў нашага земляка, у якіх прымаюць удзел чытачы бібліятэкі. Запісы размяшчаюцца ў віртуальным музеі і таксама на ютуб-канале бібліятэкі https://www.youtube.com/@user-kt9oj1is2f.

  

Прэзентацыя віртуальнага музея М. Скрыпкі адбылася на нарадзе работнікаў ДУК «Бярэзінская цэнтральная раённая бібліятэка» і сярод удзельнікаў месячніка «Літаратурнае краязнаўства ў асобах».

У раздзеле **«У Саюзе пісьменнікаў БССР»** можна азнаёміцца з копіямі шматлікіх матэрыялаў Саюза пісьменнікаў БССР, якія датычацца Міхася Скрыпкі.

У планах бібліятэкі правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на прапаганду віртуальнага музея М. Скрыпкі сярод настаўнікаў і навучэнцаў школ горада.

**«Виртуальный музей борисовского поэта Леонида Рашковского»**

***Копыток Елена Сергеевна**, директор ГУК «Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева»*

Леонид Рашковский родился 9 января 1937 г. в Борисове. Рифмовать мысли поэт начал еще в школьные годы. Из воспоминаний Л.Ф. Рашковской: *«Его сочинение на выпускных экзаменах, написанное в поэтической форме, было напечатано в борисовской газете «За коммунизм»*.

В 1967 г. Леонид стал победителем республиканского фестиваля молодых поэтов, проходившего под девизом «По дорогам славы отцов». А в 1968 г. в серии «Первая книга поэта» в издательстве «Беларусь» вышел первый сборник стихов «Пускай не умирают звезды». Его стихи печатались на страницах газет и журналов: «Советская Белоруссия», «Комсомольская правда», «Медицинская газета», «Літаратура і мастацтва» «Знамя юности», «Неман», «Дружба народов», «Беларусь», в ежегодных сборниках «Дзень паэзіі». Стихи звучали по радио, становились песнями и романсами. 25 декабря 1970 года Леонид был принят в Союз писателей. Рекомендацию он получил от известных белорусских поэтов Сергея Граховского и Василия Зуёнка. Поэт Рашковский – преимущественно русскоязычный автор, но прекрасно знал белорусский язык, писал на нем, занимался переводами.




**О чем его поэзия?** О Человеке, о вере в него и в будущее, которое будет непременно прекрасно. О смысле жизни и ее простых радостях. О любви к Родине и родному Борисову – писал о нем тепло и с нежностью, а реку Березину называл рекой юности. О земляках, спасших страну в годы Великой Отечественной войны, память о которых должна быть священной для всех будущих поколений. О преклонении перед матерью и любви к женщине.

Как Человек и Поэт, оставил о себе добрую память у борисовских любителей искусства слова. В первую очередь, у тех, кто его создает. Немало известных авторов-земляков, достигших высот в творчестве, благодарны ему за счастье личного с ним знакомства: поэт и журналист Александр Быков; прозаик Василь Гигевич; прозаик и журналист, начинавшая как поэт, Алена Браво (девичья Гинзбург); поэт и прозаик

Валентина Леви... Перечень имен может быть продолжен. И, конечно же, поэт, переводчик, сценарист киностудии «Беларусьфильм» Михась Стригалёв, принявший от Рашковского на себя ответственность за деятельность литобъединения «Бярэзіна». Оно и сегодня продолжает работать. Только менялись названия и «порт приписки»: «Бярэзіна» – «Ковчег» – «Натхненне», которое полноценной жизнью живет под крышей Борисовской центральной районной библиотеки им. И. Х. Колодеева». И это по-своему символично. Рашковский до последнего находил возможность включать в расписание своей наполненной болью жизни встречи с библиотекарями и читателями. После них, эмоциональных и поучительных, библиотечная коллекция книг с автографами пополнялась его сборниками с дарственными надписями. В полной мере авторскими их назвать нельзя – лишь сама подпись является собственноручным «росчерком пера». Ко времени издания книг его физические возможности постепенно истощались, и тексты инскриптов написаны рукой сопровождавших его лиц. Но автографы поэта вполне читаемы.

Менялись не только название и адрес литобъединения, менялись и его руководители. Сегодня это сотрудник библиотеки Елена Брицкая, активно пишущий поэт и прозаик, издавшая несколько собственных книг. И в ее биографии на этапе вхождения в поэзию еще в школьном возрасте личное присутствие Рашковского стало по-своему знаковым. И наша коллективная ответственность сегодня – вести активную работу по увековечению памяти Леонида Рашковского. Его звезда на поэтическом небосклоне Борисовщины должна не только оставаться притягательной для земляков. Важно, чтобы на ее свет стремились почитатели поэзии иных географических координат! Самый действенный способ в этом процессе – популяризация творчества поэта с использованием цифровых технологий. В числе форматов – Виртуальный музей.

Стимулом для ускорения процесса создания данного персонального электронного ресурса стал областной конкурс на создание лучшего виртуального музея на сайте библиотеки в рамках областного проекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю».

Ссылка на электронный ресурс: https://borlib-rashkouskimuseum.tilda.ws/



**Цель создания:**

способствовать увековечению на новом технологическом уровне памяти поэта-земляка, ставшего одним из символов литературной истории Борисовщины;

повысить интерес читателей библиотеки и удаленных ее пользователей к фондам и Интернет-ресурсам библиотеки по литературной составляющей историко-культурного наследия Борисовщины;

подтвердить статус регионального ресурсного центра по теме конкурса «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю».

**Задачи:**

перевод в цифровой формат персональной документной базы Л. Рашковского;

продвижение ресурса через социальные сети непосредственно на рабочий стол читателя / пользователя;

активизация использования творческого наследия поэта в гражданско-патриотическом воспитании подрастающего поколения земляков;

привлечение литобъединения «Натхненне» центральной библиотеки к популяризации творческого наследия поэта.

**Значимость электронного ресурса.**

**Международная значимость:** в сохранении информационной и эмоциональной связи земляков, проживающих за пределами края и Беларуси, с малой родиной через литературную составляющую ее культуры.

**Республиканская значимость**: в обнародовании роли ГУК «Борисовская центральная районная библиотека им. И.Х. Колодеева» в деле сохранения и продвижения к пользователю литературного наследия Борисовщины;

в объединении усилий библиотек Минской области и Беларуси по созданию виртуального клуба литераторов «корчагинцев» (имеющих инвалидность)

**Региональная значимость**: в обращении внимания жителей края на роль и место борисовских литераторов в истории национальной литературы;

в реализации идеи коллектива библиотеки по созданию Мемориальной литературной премии «Преодоление» имени Л. Рашковского для литераторов корчагинцев и привлечении заинтересованных в качестве творческих и социальных партнеров.

**Социальное звучание:** в стимулировании литературных дарований литераторов корчагинцев, что будет полезно для обретения ими веры в свои творческие способности; в психологической и моральной поддержке пользователей с ограниченными возможностями.

**Структура музея:**

Состоит из 4-х основных разделов:

Раздел **«Биография»:** копия рукописной автобиографии поэта, его дневник (в двух частях), исследовательская работа (доклад) учащейся 10-го класса ГУО «Гимназия № 3 г. Борисова» Е. Трутченко «Будет трудно – ну что ж ... Не согнусь, устою!» (2002), повесть-сборник о Л.С. Рашковском «Пускай не умирают звезды» (2007), а также галерея фотографий.

Раздел **«Книги»:** сканы и электронные версии шести изданий Л. Рашковского: «Пускай не умирают звезды» (1968), «Почемучка» (1973), «Трубач» (1976), «Преодоление» (1979), «На весёлой карусели» (1984), «Откровение» (1987).

Раздел **«В периодических изданиях»:** сканы всех выявленных на момент создания ресурса газетных и журнальных статей, посвящённых поэту.

Раздел **«В сборниках поэзии»:** поэзия, изданная в таких сборниках, как: «Дзень паэзіі» (1988, 1993, 1994, 2005), «Помнім герояў сваіх» (2015), «І зоркі над Бярэзінай-ракой...» (2008).

Вход в электронный ресурс возможен с главной страницы сайта библиотеки через баннер-заставку, а также из разделов «Ресурсы», «Читателям», «Краеведение» и электронный каталог библиотеки.

**Перспективы дальнейшего развития ресурса.**

Электронный ресурс «Виртуальный музей Леонида Рашковского» начал выполнять функцию первоисточника краеведческой и литературоведческой информации о поэте-земляке. Итог использования ресурса – более 800 просмотров.

Использованием материалов ресурса в сети библиотек проведено 13 мемориальных мероприятий, число участников – около 400 человек.

Виртуальный музей – продолжающийся электронный ресурс. Предполагается работать с ним по следующим направлениям:

дополнять новой фактографией официальную биографию поэта;

предпринимать шаги по восстановлению родословной поэта;

предпринимать шаги по формированию новой вкладки музея «Друзья Леонида Рашковского»;

дополнять фактографическими вкладками, актуальными и прошедшими мероприятиями;

разработка Положения об утверждении Мемориальной литературной премии им. Л. Рашковского «Преодоление» (к 30-летию со дня смерти поэта).

## Виртуальный музей «Синявский Иван Иванович – белорусский педагог, писатель»

***Якубович Мария Александровна**, библиотекарь I категории ГУК «Центральная городская библиотека г. Жодино»*

Электронный ресурс содержит информацию о жизни и творчестве белоруского писателя, уроженца Смолевичского района Ивана Синявского. Информация рзмещена на сайте учреждения https://libzhodino.by/ в разделе Краеведение. Переход на страницу музея по рубрикам: «О городе Жодино», далее «Известные люди» – Иван Синявский.




Виртуальный музей создан при использовании платформы Genially – инструмент для создания всех видов дидактических ресурсов, презентаций, игр, интерактивных изображений, карт, иллюстрированных процессов, резюме и т. д.

Информационные блоки оформлены в едином стиле. Переход к разделам осуществляется по гиперссылкам.




Материалы для виртуального музея были переданы родственниками писателя, часть фотоматериалов предоставил ГУК «Жодинский краеведческий музей». Также использованы документы краеведческого фонда Центральной городской библиотеки г. Жодино.




Основные рубрики виртуального музея: «О нем», «Документы», «Произведения», «Библиография», «Публикации».




Рубрика «О нем» знакомит с краткой биографией писателя. Дополнительная информация размещается на вкладке-ссылке «+ИНФО».

Синявский Иван Иванович родился в семье потомственных хлеборобов 22 июня 1919 года в деревне Жажелка Смолевичского района Минской области. Учился в Жажелковской начальной школе, потом в Смолевичской школе.

Ещё в школе он начал писать первые стихотворения, публикуясь в местных газетах. В студенческие годы состоял в литературном кружке, где познакомился со знаменитыми белорусскими литературными творцами, такими как: Янка Купала, Якуб Колас, Михась Лыньков.

В 1940 г. в газете «Літаратура і мастацтва» публикуется первый рассказ И. И. Синявского – «Шафа».

Иван Синявский является участником Великой Отечественной войны. Летом 1942 года он становится партизанским связным Смолевичского подпольного райкома партии, а в апреле 1943 года был

зачислен в отряд им. Чкалова бригады «Смерть фашизму». Отца в это время расстреляли фашисты за связь с партизанами.

Иван Иванович Синявский награжден орденом Славы III степени, орденом Отечественной войны II степени и медалями: «За отвагу», «За освобождение Варшавы», «За взятие Берлина», «За победу над Германией».

В 1949 г. выходит первый сборник автора «У навальніцу». Многие его работы посвящены военным годам, людям, которым пришлось пережить трудное военное время.

Печаталась так же и проза для детей: «У навальніцу» (1949), «Новая школа» (1951), «Дабрадзейка» (1960). Повесть «На первом фланге» посвящена нашему земляку из Жодино – Герою Советского Союза Куприянову Петру Ивановичу. Многие произведения И. И. Синявского переведены на русский, украинский, грузинский, латышский, осетинский языки.

Так же писатель написал больше ста очерков, которые были посвящены родным местам автора, знаменитым людям Борисовского и Смолевичского районов, белазовцам.

Иван Иванович принимал активное участие в создании документальной книги-хроники «Память. Смолевичский район и г. Жодино».

15 сентября 2001 года Синявского Ивана Ивановича не стало, в 2001 г. вышел в свет последний его роман «Вярыгі».

В городской библиотеке г. Жодино бережно хранятся рукописи Синявского, газетные статьи писателя, а также книги, которые может взять на дом любой желающий и познакомиться с произведениями.



В рубрике «Документы» размещены фотоматериалы, копии документов о наградах и трудовом пути Ивана Ивановича.




Сведения о книгах и произведениях писателя представлены в рубрике «Произведения». Размещены сканы обложек книг Ивана Ивановича, хранящихся в фондах городской библиотеки г. Жодино.




Раздел «Библиография» представляет собой интерактивную страницу, которая содержит: список литературы о жизни и творчестве писателя, статью Александра Морозова, посвященную 95-летию писателя И. И. Синявского, а также сценарий мероприятия «Мы з гэтых крыніц пілі воду жывую», подготовленный библиотекарем I категории И. А. Хилютич к юбилею писателя.











Раздел «Статьи и публикации» содержит ссылки на официальные сайты: belta.by, partizany.by, газеты «Край смалявіцкі», на станицах которых опубликована информация о Иване Ивановиче Синявском.




Специальный совместный проект БЕЛТА и Национального пресс-центра Республики Беларусь «Здесь был белорус…» рассказывает о белорусах и уроженцах Беларуси, сражавшихся на фронтах Великой Отечественной войны.




Имя Ивана Синявского вписано в историю взятия Берлина. *На стенах Рейхстага сохранилась коллективная надпись: «СОЛОВЬЕВ, СИНЯВСКИЙ, ЧИБИЗОВ, КОРЗУН, РЕДЬКИН».*

*Авторы – военнослужащие 207-й стрелковой дивизии (79-й стрелковый корпус, 3-я ударная армия, 1-й Белорусский фронт).*



https://specreport.belta.by/victory




На страницах спецпроекта Издательского дома «Беларусь сегодня» и Национального архива Беларуси «Партизаны Беларуси» https://partizany.by/partisans/121466/ размещены фото писателя и копия «Личного листка по учету партизанских кадров».




Статья Эльвиры Потатчик приурочена 100-летию белорусского писателя размещенная на страницах сайта «Край смалявіцкі».

В мае 2020 года в рамках Всебелорусской акции «Народная летопись Великой Отечественной войны: вспомним всех!» ГУК «Жодинский краеведческий музей» опубликовал на своем сайте материалы посвященные нашему земляку (https://zhkm.by/news/2020/2020_09_25_akcia_narodnaia_letopis_ivan_siniavski.html) .



Ежегодно ГУК «Центральная городская библиотека г. Жодино» проводит ряд мероприятий, посвященных творчеству Ивана Синявского. В 2022 году сотрудниками центральной библиотеки организован **краеведческий маршрут «Край родной открывает тайны»**. Путешествие по маршруту начиналось с литературной страницы, которая познакомила ребят с жизнью и творчеством самого известного писателя нашего города – Ивана Ивановича Синявского – члена Союза писателей Беларуси. Повесть «На правым флангу», посвящена нашему знаменитому земляку – Герою Советского Союза Петру Ивановичу Куприянову. По мотивам этого произведения сотрудники библиотеки подготовили спектакль Театра теней **«Рассказ о подвиге Петра Куприянова».** Постановка получилась пронзительной и патриотичной.

Проходят выставки по творчеству И. И. Синявского **«Дарога да чытачоў».**






Литературный вечер-портрет по творчеству Ивана Синявского «Крыніца творчасці Івана Сіняўскага» проводит библиотека для несовершеннолетних пользователей. В рамках мероприятия, учащиеся посматривают видеозапись из семейного архива И. И. Синявского, знакомятся с некоторыми произведениями автора для детей, прослушивают рассказ «Суседскія дзяўчынкі». В конце мероприятия дети рисуют сюжеты, навеянные творчеством писателя.




На сегодняшний день специалистами ГУК «Центральная городская библиотека г. Жодино» разрабатывается новая версия виртуального музея. Цель нового проекта – популяризация творчества поэтов и прозаиков г. Жодино. Виртуальный музей предоставит возможность не только ознакомиться с жизнью авторов и аналитическими эссе об их творчестве, но и виртуально познакомится с творчеством каждого из них. Этот уникальный проект позволит всем желающим погрузиться в мир литературы и исследовать творчество писателей города. Новое программное обеспечение расширит возможности отображения и поиска информации на страницах музея, будут определены новые разделы и рубрики, размещены полнотекстовые документы и видеофайлы.

## «Віртуальны музей Кузьмы Чорнага»

***Гняцько Таццяна Анатольеўна****, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу;*
***Астрэйка Таццяна Леанідаўна,*** *бібліятэкар сектара фарміравання бібліятэчнага фонда ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі»*

Электронны рэсурс змяшчае інфармацыю аб жыцці і творчасці класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага (Мікалая Карлавіча Раманоўскага), папулярызацыі яго творчасці і ўшанаванні памяці.

Дадзены рэсурс размешчаны на галоўнай старонцы сайта ДУК «Капыльская раённая цэнральная бібліятэка імя Анатоля Астрэйкі» www.kapyl.by пад назвай «Віртуальны музей Кузьмы Чорнага» https://view.genial.ly/653faad3cee40f0011597d8a/interactive-image-interactive-image.

Платформай для стварэння віртуальнай выставы стаў шматфункцыянальны дадатак Genially, з яго дапамогай і быў створаны «Віртуальны музей Кузьмы Чорнага». Для падачы інфармацыі была абрана інтэрактыўная выстава-плакат з фактамі з жыцця і творчасці Кузьмы Чорнага ў выглядзе афіш з гіперспасылкамі. Выстава даступна не толькі анлайн але і афлайн.




Віртуальны музей складаецца з 6 частак: «Капыльшчына… душа рвецца сюды…», «Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма», «Кузьма Чорны: з Цімкавіч – у свет вялікі…», «Яскравыя знічкі з біяграфіі класіка», «Натхняе творчасць земляка», «Урокі класіка».

Капыльшчына дала гісторыі выдатных дзеячаў літаратуры і гісторыі, мастацтва і культуры, многія з якіх сёння вядомы далёка за межамі Беларусі. У Капылі, напрыклад, нарадзіўся роданачальнік і класік новай яўрэйская літаратуры Мендэле-Мойхер-Сфорым, Зося (Зоф’я) Манькоўская, Леанард Падгорскі-Аколаў. У аўтабіяграфіі канадская пісьменніца Эйда Мазэ распавядала пра свае дзіцячыя гады на Капыльшчыне… Капыльская зямля – гэта малая радзіма больш чым 50-ці пісьменнікаў. На Капыльшчыне нарадзіўся і класік беларускай літаратуры Кузьма Чорны.




Таму першы раздзел пад назвай **«Капыльшчына… душа рвецца сюды…»** прысвечаны знаёмству са знакамітасцямі Капыльскага краю, яго багатай гісторыі, многімі выдатнымі людзмі, якія нарадзіліся ці жылі тут. Пра ўсё гэта можна даведацца з відэафільма «Капыль паміж мінулым і будучым». Таксама тут прадстаўлены вокладкі кніг з анатацыямі, якія знаёмяць з вядомымі дзеячамі навукі, эканомікі і культуры з Капыльшчыны, якія вызначыліся сваім талентам і майстэрствам, творчай працай і прафесійнымі дасягненнямі.

Цімкавічы і Кузьма Чорны – адно непадзельнае цэлае. Хочаш больш даведацца пра пісьменніка – паедзь на яго радзіму. Вытокі прозы Кузьмы Чорнага – на Капыльшчыне, у мястэчку Цімкавічы. Тут прагучала яго славутае: «Чалавек – гэта цэлы свет». Менавіта на зямлі бацькоў з’явілася разуменне, што «пра людзей можна расказваць бясконца…».

Пісьменнік стаў гонарам Цімкавіч, своеасаблівай зоркай-сімвалам. І вядзе людзей сюды, на радзіму класіка, дарога, каб пакланіцца яго памяці і вялікаму мастацкаму таленту.




Раздзел **«Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма…»** знаёміць з гісторыяй мястэчка Цімкавічы, са знакамітымі дзеячамі, якія нарадзіліся ў Цімкавічах.

З цікавым шляхам да граматы Мікалая Раманоўскага, будучага класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага, знаёміць выданне **«Цімкавіцкая сярэдняя школа імя Кузьмы Чорнага: гісторыя і сучаснасць».** У зборнік увайшлі разнастайныя матэрыялы, у якіх асвятляецца гісторыя Цімкавіцкай сярэдняй школы імя Кузьмы Чорнага.

Таксама ў раздзеле можна пазнаёміцца з прэзентацыяй **«…Дзе прайшло маленства, там пачынаецца радзіма…»** па ўшанаванні памяці Кузьмы Чорнага на Радзіме.

Чорны быў не толькі выдатным мастаком слова, які мог лёгкім рухам пяра стварыць запамінальны пейзаж, захапіць чытача займальным сюжэтам і дэтэктыўнай інтрыгай, але і ўразіць рэдкай чуласцю да беларускага слова, яго выяўленчых і інтэлектуальных магчымасцей.

За дваццаць адзін год сваёй нястомнай літаратурнай дзейнасці Кузьма Чорны напісаў дзесяць кніг апавяданняў, пятнаццаць раманаў і аповесцей, некалькі п’ес, вялікую колькасць нарысаў, фельетонаў, публічных і літаратурна-крытычных артыкулаў.

Кузьма Чорны горача любіў свае родныя Цімкавічы, свой народ і яго мову. «Родныя мае мясціны, – пісаў празаік. – Там жывуць усе мае персанажы. Усе дарогі, пейзажы, дрэвы, хаты, чалавечыя натуры, пра якія я калі-небудзь пісаў. Гэта ўсё адтуль, сапраўднае».

Ен шмат паспеў зрабіць за 44 гады, якія адмераў яму лёс. Ён сказаў




сваё слова – ад імя народа перад цэлым светам. Яму было што сказаць. І разам з тым – як многа не паспеў сказаць з таго, пра што думалася. Апошні запіс у дзенніку зроблены ў дзень смерці, 22 лістапада 1944 года: «Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?»

У раздзеле **«Кузьма Чорны: з Цімкавіч – у свет вялікі…»** прадстаўлена вокладка зборніка серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі», прысвечанага Кузьме Чорнаму. У зборніку сабраны ўспаміны, артыкулы, эсэ, інтэрв’ю яго родных, пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, дзеячаў мастацтва. Яны ствараюць партрэт чалавека, які меў шчасце быць мастаком слова «Боскай міласцю» і зведаў на ўласным лёсе ўсе цяжкасці, што выпалі на долю яго пакалення, але не здрадзіў сабе, чытачам, Бацькаўшчыне. Зборнік складаецца з пяці раздзелаў. Першы прысвечаны сям’і і роду Раманоўскіх, другі ўключае ўспаміны сучаснікаў Кузьмы Чорнага, трэці – погляд літаратуразнаўцаў розных пакаленняў на творчасць класіка, чацвёрты –

мемуарная і эпісталярная спадчына пісьменніка, пяты – ушанаванне яго памяці.




Вялікі талент – гэта заўсёды вялікія таямніцы. А таямніцы пачынаюцца з дзяцінства… Кузьма Чорны быў здольны хлопчык: граў на розных музычных інструментах, у школьных спектаклях, меў прыгожы голас, умеў цудоўна апавядаць розныя гісторыі. Кузьма Чорны, быў не толькі пісьменнікам, але і спрабаваў сябе ў ролі мастака: ствараў ілюстрацыі да сваіх твораў. Аб гэтым распавядаецца ў раздзеле **«Яскравыя знічкі з біяграфіі класіка».**




У раздзеле **«Урокі класіка»** прапанавана прэзентацыя «Чытаем творы Кузьмы Чорнага», у якой прадстаўлены вокладкі кніг і анатацыі да іх.




Кажуць, чалавек жыве датуль, пакуль аб ім памятаюць. Памяць пра Кузьму Чорнага беражліва захоўваюць у Цімкавічах, тут шануюць імя беларускага класіка і яго спадчыну, беражліва захоўваюць таксама гістарычную памяць пра месцы, дзе прайшла яго жыццёвая і творчая дарога. Працягваючы добрую традыцыю па ўшанаванні памяці нашага знакамітага земляка, можна даведацца з раздзела **«Натхняе творчасць земляка»,** у якім размешчана прэзентацыя выстава творчых работ «Сцежкамі Кузьмы Чорнага» (у рамках праекта «Книга. Кисти. Карандаш»), верш прысвечаны «Кузьме Чорнаму» і ўрывак «Вялікае скрыжаванне» з рамана «Пошукі будучыні» ўдзельніка праекта «Малая радзіма вялікіх людзей».



Застаецца спадзявацца і верыць, што новыя пакаленні дзяцей і моладзі будуць жыць з любоўю ў сэрцы і павагай да сваёй радзімы, будуць ганарыцца роднай Капыльшчынай, яе славутымі і таленавітымі людзьмі,

захаваюць і працягваць лепшыя традыцыі продкаў, бацькоўскай зямлі, якая даецца нам Богам і лёсам.

Прэзентацыя «Віртуальнага музея Кузьмы Чорнага» адбылася ў лістападзе 2023 года на літаратурна-музычнай імпрэзе «Пісьменнік вялікай душы» ў Цімкавіцкай сярэдняй школе імя Кузьмы Чорнага. Таксама віртуальны музей быў прадстаўлены на нарадзе бібліятэкараў ДУК «Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі» і ў Цімкавіцкай сельскай бібліятэцы для наведвальнікаў бібліятэкі.

У рамках рэалізацыі праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» адбыўся шэраг мерапрыемстваў па ўшанаванні памяці Кузьмы Чорнага.

У лютым 2022 года у рамках рэспубліканскага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» ў Нацыянальнай бібліятэцы адбыўся навукова-практычны семінары «Ураджэнцы роднага краю», прысвечаны пісьменнікам-«маладнякоўцам». Супрацоўнікі Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі падзяліліся вопытам работы па ўшанаванні памяці Кузьмы Чорнага, а таксама ў лістападзе 2022 года прынялі ўдзел у Міжнародным анлайн-праекце «Современная библиотека»: загадчык Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі падзялілася вопытам работы па тэме «Библиотека как субъект культурной жизни сельской местности».

У жніўні 2022 года ў Капылі праходзіла культурна-спартыўнае свята «Вытокі. Крок да Алімпу». Для прадстаўнікоў СМІ, удзельнікаў прэс-тура «Гісторыка-культурная спадчына» супрацоўнікі Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі правялі літаратурнае падарожжа па «Алеі пісьменнікаў Капыльшчыны», а работнікі Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі – пазнавальны экскурс «Цімкавічы: ад старажытнасці да сучаснасці».



Два гады запар на радзіме славутага сына Капыльскай зямлі Кузьмы Чорнага ў аграгарадку Цімкавічы праводзілася літаратурна-музычнае свята «Цімкавіцкія вытокі» з нагоды дня нараджэння пісьменніка. У 2022 годзе Капыльскай раённай цэнтральнай бібліятэкай імя А. Астрэйкі сумесна з Цімкавіцкай сельскай бібліятэкай была арганізавана інтэрактыўная пляцоўка #чытайце_з_намі, у рамках якой жыхарам і гасцям свята была прапанавана выстава-знаёмства «Як мая душа рвецца сюды…», прысвечаная малавядомым звесткам з жыцця Кузьмы Чорнага, а супрацоўнік Цімкавіцкай бібліятэкі ўдзельнічала ў сцэнічна-біяграфічнай замалёўцы «Шматок сала». У 2023 годзе Капыльскай бібліятэкай была

арганізавана інтэрактыўная пляцоўка «Родныя мае мясціны, як мая душа рвецца сюды…» і праведзены конкурс «Чалавек – гэта цэлы свет», які праходзіў ў 2-х намінацыях: «Літаратурная творчасць» і «Вяўленчае мастацтва», на які было пададзена больш за 40 работ. Хочацца адзначыць, што на конкурс былі прадстаўлены дастойныя работы і на свяце «Цімкавіцкія вытокі» пераможцы атрымалі ўзнагароды.

Цімкавіцкая сельская бібліятэка вядзе цесную супрацу з Літаратурным музеем Кузьмы Чорнага. Дзякуючы гэтаму супрацоўніцтву, у рамках праекта «Пісьменнікі - ураджэнцы роднага краю» ладзілася шэраг мерапрыемстваў розных форм з вучнямі школ Капыльскага, Клецкага, Нясвіжскага, Слуцкага раёнаў, са студэнтамі БарДУ і Капыльскага каледжа.

З нагоды 100-годдзя як з'явіўся псеўданім «Кузьма Чорны» была арганізавана літаратурна-музычная імпрэза «Ад Міколы Раманоўскага да Кузьмы Чорнага» (2023). Да дня ўшанавання памяці Кузьмы Чорнага ў Цімкавіцкай сярэдняй школе прайшла літаратурна-музычная імпрэза «Пісьменнік вялікай душы», музейныя пасядзелкі «Ля самавара Кузьмы Чорнага», літаратурная-музычная гасцёўня «Пункт імкнення – універсітэт» і інш.

Наогул, у публічных бібліятэках раёна прайшло каля 30 мерапрыемстваў у рамках праекта.

Папулярызацыя творчасці Кузьмы Чорнага адбывалася і на розных мерапрыемствах у рамках гарадскіх, раённых і абласных святаў:

кургане Славы, на тэматычных выставах выхаднога дня;

інтэрактыўнай пляцоўцы «Город читающих людей», у зоне адпачынку, прысвечанай Дню горада;

інтэрактыўнай пляцоўцы «Родныя мае мясціны, як мая душа рвецца сюды…» у аг. Цімкавічы на абласным свяце «Цімкавіцкія вытокі».

Праводзіліся літаратурный гульні, віктарыны па творчасці пісьменніка







**Чаканыя вынікі:**

павышэнне цікавасці да творчасці Кузьмы Чорнага;

фарміраванне чытацкай цікавасці;

павышэнне наведвальнасці сайта.

**Перспектывы далейшага развіцця рэсурсу:**

збор краязнаўчай інфармацыі, фарміраванне краязнаўчых рэсурсаў, папулярызацыя літаратурнай спадчыны рэгіёна праз інтэрнет-рэсурсы;

павышэнне іміджу і прэстыжу бібліятэкі праз прасоўванне ў інтэрнет-прасторы;

стварэнне інфармацыйнага цэнтра і адкрытай пляцоўкі для ўсіх жадаючых, якія цікавяцца літаратурнай спадчынай рэгіёна;

пазіцыяніраванне бібліятэкі як інфармацыйнага цэнтра для тых, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай свайго краю.

**«Васіль Васільевіч Зуёнак: віртуальны кабінет»**

***Маркушэўская Ліана Ігараўна,***
*метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы»*

Электронны рэсурс змяшчае інфармацыю аб жыцці і творчасці беларускага паэта, празаіка, літаратуразнаўца і дзіцячага пісьменніка Васіля Васілевіча Зуёнка.

Перайсці ў дадзены рэсурс можна праз укладку «Виртуальный кабинет В. Зуёнка» https://krupkilib.by/virtualnyj-kabinet-v-zujonka.html на галоўнай старонцы сайта ДУК «Крупская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы» https://krupkilib.by. У якасці кнопкі выкарыстоўваецца малюнак.









На галоўнай старонцы рэсурса размешчаны наступныя раздзелы: «Біяграфія», «Творчасць», «Паэт у друку».

У раздзеле «Біяграфія» змешчаны кароткія біяграфічныя звесткі пра аўтара, а таксама падраздзел «Цікавыя факты з біяграфіі» і бібліяграфічны спіс з артыкуламі пра Васіля Зуёнка.

Раздзел «Творчасць» паказвае шматграннасць і разнастайнасць творчасці Васіля Зуёнка і змяшчае некалькі падразделаў:

«Паэзія», «Проза, крытыка, эсэістыка», «Творы для дзяцей», дзе прадстаўлены вокладкі са спасылкамі на анатацыі да выданняў;




«Па старонках кніг» з некаторымі поўнатэкставымі выданнямі пісьменніка;

«Васіль Зуёнак аб малой Радзіме», дзе прадстаўлены вершы паэта аб Крупшчыне.

Раздзел «Паэт у друку» змяшчае некаторыя артыкулы, прысвечаныя творчасці Васіля Зуёнка: артыкулы з газет «Звязда», «СБ. Беларусь сегодня», а таксама з раённай газеты «Крупскі веснік».

Матэрыялы, якія былі сабраны ў кабінеце, мелі практычнае выкарыстанне на розных мерапрыемствах, напрыклад:

літаратурная прышчэпка на мемарыяльным комплексе «Курган славы» ў рамках цыклу мерапрыемстваў «Крупшчына літаратурная»;

прэзентацыя кніжнай выставы «Паэтычны свет Васіля Зуёнка» ў чытальнай зале Крупскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы;

паэтычная гадзіна «Паміж небам і зямлёй» у чытальнай зале Крупскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы;

паэтычны ланцужок «І жаўранак, і цэлы свет у сэрцы» ў Узнацкай сельскай бібліятэцы-клубе;

паэтычная хвіліна «Паэзіі птушка чароўная» да дня нараджэння Васіля Зуёнка ў Халопеніцкай гарпасялковай бібліятэцы і іншыя.








## «Віртуальны музей народнага паэта Беларусі Ніла Сымонавіча Гілевіча»

***Глушакова Ірына Мікалаеўна****, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»*

У гонар ушанавання памяці сапраўднага мастака беларускага слова супрацоўнікі ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка» стварылі «Віртуальны музей народнага паэта Беларусі – Ніла Сымонавіча Гілевіча», прысвечаны яго жыццю, творчасці, спадчыне, яго следу ў беларускай і сусветнай літаратуры.




Віртуальны музей складаецца з адзінаццаці раздзелаў, матэрыялы кожнага з якіх ахопліваюць розныя бакі шматграннай жыццёвай і творчай дзейнасці Ніла Гілевіча. Шматлікія звесткі падмацаваны ўспамінамі і выказваннямі сяброў і калег па пяру, тэкстамі з перыядычных выданняў, інтэрв’ю, фотаздымкамі.

Грунтоўна разглядаецца літаратурная спадчына паэта і яго перакладчыцкая дзейнасць, даецца частковы бібліяграфічны агляд яго кніг, прыводзяцца тэксты літаратурна-крытычных артыкулаў.

Музей складаецца з наступных раздзелаў:

**Летапіс дзяцінства Ніла Гілевіча** змяшчае звесткі пра бацькоў паэта, гады яго дзяцінства, апаленага ваенным ліхалеццем.

**Дарогай юнацтва** змяшчае звесткі пра юнацкія гады паэта, пачатак яго творчага патэнцыялу.

**Творчы шлях** змяшчае звесткі пра жыццё пасля вучобы і творчую дзейнасць Ніла Гілевіча.

**Выданні Ніла Гілевіча** змяшчае бібліяграфічныя звесткі і кароткія анатацыі пра кнігі, напісаныя паэтам.

**Вы шуміце бярозы...** змяшчае тэксты песень на вершы Н. Гілевіча.

**Крытычныя артыкулы** змяшчае аблічбаваныя крытычныя артыкулы пра Н. Гілевіча, надрукаваныя ў розных часопісах і сабраныя ў краязнаўчым фондзе цэнтральнай бібліятэкі.

**Словы пра Ніла Гілевіча** змяшчае ўспаміны знакамітых людзей пра ўспрыманне творчасці Н. Гілевіча.

**Узнагароды і прэміі** ўтрымлівае звесткі аб узнагародах і прэміях Н. Гілевіча за вялікія заслугі ў развіцці беларускай мастацкай літаратуры.

**Ушанаванне памяці** змяшчае звесткі аб рабоце па захаванні памяці пра Н. Гілевіча, якая вядзецца ў Лагойскай раённай цэнтральнай бібліятэцы і Гайненскай СШ, дзе вучыўся паэт.

**Фота з сямейнага архіва Ніла Сымонавіча і Ніны Іванаўны Гілевічаў** змяшчае фотаздымкі з сямейнага архіва.




Віртуальны музей патрэбны сучаснаму грамадству як новы напрамак у дзейнасці развіцця бібілятэк Лагойскага раёна. З яго з’яўленнем будзе назірацца фарміраванне і развіццё зацікаўленасці насельніцтва да краязнаўства, павелічэнне колькасці запытаў на літаратуру краязнаўчага напрамку, рост колькасці наведвальнікаў бібліятэк, павелічэнне бібліятэчных наведванняў, у тым ліку і віртуальных. Узнікне жаданне ствараць новыя інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы, якія змогуць размешчацца ў віртуальнай прасторы, будзе назірацца павышэнне іміджу бібліятэк як цэнтраў краязнаўства.

## «Віртуальны музей Язэпа Пушчы»

***Камлюк Марына Аляксандраўна**, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка»*

Электронны рэсурс змяшчае інфармацыю аб жыцці і творчай дзейнасці Язэпа Пушчы. Перайсці ў музей можна праз укладку «Літаратурны свет у пытаннях» на афіцыйным сайце ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» minskaya-rcb.by, а далей праз меню раздела «Літаратурная палічка» – «Язэп Пушча».

Усе раздзелы музея афармлены ў адным стылі, у якасці кнопак выкарыстоўваюцца малюнкі з гіпер-спасылкамі.




На галоўнай старонцы музея размешчаны кароткія біяграфічныя звесткі пра аўтара (жыццёвы і творчы шлях) з фатаграфіямі і дакументамі з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Пасля аўтабіяграфіі і раздзелаў прадстаўлены: «Відэафрагмент сустрэчы з сярэдняй дачкой Язэпа Пушчы Лідзіяй Іосіфаўнай», які падрыхтавалі вучні і настаўнікі Навадворскай сярэдняй школы Мінскага раёна, «Кінавідэафонд Белтэлерадыёкампаніі. Абласны круглы стол «Захаванне і папулярызацыя гістарычнай памяці. Пісьменнікі-землякі: Язэп Пушча» (інтэрв’ю Белтэлерадыёкампаніі) і «Карысныя спасылкі» на сайт Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў раздзелы: «Да 120-годдзя Язэпа Пушчы (Іосіф Паўлавіч Плашчынскі)» і анлайн-энцыклапедыю «Беларусь у асобах і падзеях»; трэцяя спасылка – на электронную бібліятэку «Беларуская палічка».



На галоўнай страронцы размешчаны наступныя разделы: «Цікавыя факты ў gif-анімацыі», «Інтэрактыўныя гульні», «Раённы конкурс

чытальнікаў «Я за дабро плачу дабром», «Раённы конкурс чытальнікаў «Імёны незабытых: Язэп Пушча», «Друкаваная прадукцыя», «Віртуальныя выставы», «Відэа-агляд», «Ушанаванне памяці».

Раздзел «Цікавыя факты ў gif-анімацыі» зручны для тых, хто не хоча губляць шмат часу на чытанне аўтабіяграфіі ці прагляд доўгіх ролікаў, а хоча ў кароткай форме пазнаёміцца з матэрыялам.




Гіпер-спасылкі:

«Раённы конкурс чытальнікаў «Я за дабро плачу дабром» перамяшчае ў архіў з відэаролікамі чытальнікаў, якія былі сабраны да 120-годдзя з дня нараджэння паэта ў 2022 годзе. Прэзентаваны ролікі чытальнікаў ва ўзросце да 15 гадоў.

«Раённы конкурс чытальнікаў «Імёны незабытых: Язэп Пушча»: відэаролікі чытальнікаў ад 15 гадоў у 2023 годзе да Дня роднай мовы.

На гэтых старонках размешчаны: Палажэнне конкурсу, відэаролікі падвядзення вынікаў і віртуальныя дыпломы ўдзельнікаў.






На старонцы «Друкаваная прадукцыя» размешчаны інфармацыйныя паказальнікі, буклеты, лістоўкі ў PDF-фармаце, «Артыкулы пра Язэпа Пушчу ў перыёдыцы», якія з'яўляюцца гіпер-спасылкамі.




Раздзел «Віртуальныя выставы» зручны для ўспрымання карыстальнікамі ў вэб-прасторы.

Ва ўкладцы «Відэаагляд» можна пазнаёміцца з матэрыялам «Душа мая і голас мой у вершах застануцца жыць...», які падрыхтавала бібліятэкар Шаршунскай інтэграванай сельскай бібліятэкі Гаеўская Ала Вітальеўна.

На старонцы «Ушанаванне памяці» сабраны матэрыял (выставы, мерапрыемствы), які назапашаны за гады работы ў бібліятэках.




Актыўна выкарыстоўваюцца гульнёвыя формы работы, што дае магчымасць чытачам з лёгкасцю запамінаць інфармацыйны матэрыял і пранікнуцца непаўторнай атмасферай творчасці Язэпа Пушчы. З гэтай мэтай была створана і размешчана на сайце бібліятэкі гульнятэка «Інтэрактыўныя гульні».

Віктарына пра жыццё і творчасць паэта абсталявана візуальнай зваротнай сувяззю пры выбары правільнага ці няправільнага адказу на прапанаваныя пытанні.








У інтэрактыўнай гульні «Знайдзі пару» прапануецца злучыць выявы асабістых рэчаў Язэпа Пушчы з іх назвай. Калі злучаюцца неадпаведныя дэталі, то яны вылучаюцца чырвоным колерам.

У асацыятыўнай галаваломцы новага пакалення «Кросенс» можна пашукаць «скрыжаванне сэнсаў». Кросенс уяўляе сабой серыю малюнкаў, знакаў, дзе кожная выява злучана з папярэдняй і наступнай па сэнсе.

Галаваломнае прыстасаванне «Рэбус» спалучае ў сабе выкарыстанне малюнкаў з асобнымі літарамі для паказу слоў ці фраз.

Прэзентацыя віртуальнага музея прайшла на абласным круглым стале «Захаванне і папулярызацыя гістарычнай памяці. Пісьменнікі-землякі: Язэп Пушча» ў рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю». Падчас яго адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне пераможцаў раённага конкурсу чытальнікаў «Імёны незабытых: Язэп Пушча».



Мінская раённая цэнтральная бібліятэка прымала абласны семінар «Продвижение чтения: организация информационного пространства в библиотеке» для загадчыкаў аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі, загадчыкаў аддзелаў бібліятэчнага маркетынгу і аўтаматызацыі Мінскай вобласці і іншых абласцей. Было распрацавана навучальнае відэа на прыкладе стварэння музея Язэпа Пушчы.





Падрыхтаваны навучальны практыкум для спецыялістаў бібліятэк «Создание виртуального музея: постановка технического задания и творческое воплощение». Відэаўрок практыкума быў размешчаны на сайце бібліятэкі.

Мінская раённая цэнтральная бібліятэка прыняла ўдзел у X Міжнародным кангрэсе «Библиотека как феномен культуры», прымеркаваным да Года міру і стварэння, які праходзіў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У рамках круглага стала «Цифровая трансформация библиотечной деятельности» выступіла загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Камлюк М.А. з дакладам «Віртуальны музей як сродак захавання і папулярызацыі гістарычнай памяці».

Матэрыялы, якія былі сабраны ў музеі, мелі практычнае выкарыстанне на розных мерапрымствах, у тым ліку і выязных, напрыклад:

г.Маладзечна, падчас Нацыянальнага фэста беларускай песні і паэзіі «Молодечно-2023»;

Курган Славы, на тэматычных выставах выхаднога дня;

аг. Міханавічы, на раённых Дажынках і святкаванні 150-годдзя заснавання аграгарадка;

г. Мінск, інтэрактыўная выстава «Родны край – крыніца натхнення» - да 85-годдзя Мінскай вобласці.



Перайшоўшы па QR-кодах, удзельнікі маглі наведаць віртуальны музей Язэпа Пушчы, а таксама віртуальны кабінет юбіляра 2023 года – аўтара гімна Беларусі Уладзіміра Карызны, таксама і інфармацыйныя старонкі іншых пісьменнікаў, пазнаёміцца з біяграфіяй і творчасцю аўтараў.

# «Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча»

***Зубрыцкая Алена Антонаўна***, *загадчык аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Багдановіча»*

Электронны рэсурс «Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча» змяшчае інфармацыю аб жыцці і творчасці пісьменніка, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, Івана Іванавіча Галубовіча (Янкі Галубовіча, Янкі Баравога), папулярызацыі і ўшанаванні яго памяці.

Перайсці ў рэсурс можна праз укладку «Віртуальныя музеі» на галоўнай старонцы сайта ДУК «Маладзечанская цэнральная раённая бібліятэка імя М.Багдановіча» https://molib.by/, потым праз кнопку «Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча» https://molib.by/golubovich.



Матэрыялы для віртуальнага музея былі прадстаўлены жонкай пісьменніка, Яўгеніяй Уладзіміраўнай, пісьменнікам і краязнаўцам М. Казлоўскім, таксама выкарыстоўваліся матэрыялы з архіваў «Маладзечанскай газеты» і бібліятэк ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча».

Янка Галубовіч – аўтар 16 кніг прозы для дзяцей і дарослых. Акрамя таго, яго казкі і апавяданні ўвайшлі ў дзясяткі калектыўных зборнікаў, школьныя хрэстаматыі, анталогіі, уключаны ў падручнікі па беларускай мове з першага па чацвёрты клас. Мудрыя казкі, апавяданні пісьменніка фарміруюць асобу маленькага чалавека, уплываюць на характар, вучаць любіць прыроду, сваю краіну, мову.

Галоўныя тэмы яго кніг для дарослых – дэградацыя чалавека як асобы, страта маральных прынцыпаў і ідэалаў, адсутнасць нацыянальнай самапавагі і гонару, крывадушша, хлусня, ашуканства і, як вынік усяго гэтага, поўная абыякавасць да будучыні сваёй зямлі.

Ёсць у яго апавяданні на тэму Вялікай Айчыннай вайны, пісаў аўтар і пра герояў Афганістана, багата і вобразна распавядаў пра жыццё

беларускай вёскі, таксама ў яго – унікальныя і яскравыя апавяданні пра прыроду.

У творчым спісе празаіка ёсць і вострасюжэтныя дэтыктыўныя аповесці «Стрэл за дзвярыма», «Вяселля не будзе», «Сляды вялі ад дзявочай горкі», у якіх расказваецца пра трывожныя будні супрацоўнікаў крымінальнага вышуку. Знаёмячыся з гэтымі аповесцямі, чытачы даведваюцца, як супрацоўнікам міліцыі за кароткі час удаецца раскрыць злачынствы.

Віртуальны музей складаецца з дванаццаці раздзелаў. На галоўнай старонцы змяшчаюцца іх назвы і партрэт пісьменніка.

Раздзел **«Жыццяпіс»**, у якім, у сваю чаргу, ёсць падраздзел пра вёску Пранчэйкава Гарадоцкага сельсавета Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці (да 1960 года Хоўхлаўскага сельсавета Радашковіцкага раёна Маладзечанскай вобласці), дзе нарадзіўся і вырас пісьменнік. Вёсачка невялікая – на 01.01.2023 у ёй пражывала 55 чалавек.

**Кароткі біяграфічны нарыс.** Вучыўся Янка Галубовіч у Пранчэйкаўскай сямігадовай школе, а восьмы клас заканчваў у вёсцы Гарадок. Скончыў Глыбоцкае вучылішча механізацыі, а яшчэ – Мінскі фінансавы тэхнікум і факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Служыў у арміі, працаваў на трактарным заводзе ў Рубцоўску (РФ), на заводзе сілавых паўправадніковых вентыляў (цяпер «Электрамодуль») у Маладзечне.

У падраздзеле **«Незабыўныя сустрэчы»** расказваецца пра сустрэчы Янкі Галубовіча з тымі, хто сёння з’яўляецца гонарам беларускай літаратуры: драматург Іван Козел, празаік Аркадзь Чарнышэвіч, пісьменнік і краязнаўца Генадзь Каханоўскі, вядомы гісторык і літаратуразнаўца Мікола Ермаловіч.

У раздзеле **«Фотахроніка»** размешчаны здымкі пісьменніка. Ёсць яго фота ў маладым узросце, у дні армейскай службы, на сямейных святах, а таксама сканы з дакументаў: ваенны білет, дыпломы аб заканчэнні фінансавага тэхнікума і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, членскі білет Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Шэраг фотаздымкаў расказвае пра ўдзел Івана Іванавіча ў мерапрыемствах бібліятэк. Яго запрашалі на творчыя сустрэчы з чытачамі; у журы літаратурных конкурсаў; пасяджэнні літаратурна-краязнаўчага аб’яднання «Жывіца», што працавала пры цэнтральнай раённай бібліятэцы; на штогадовыя выязныя імпрэзы ў Ракуцёўшчыне, прысвечаныя дню памяці Максіма Багдановіча і інш.

У раздзеле **«Кнігі»** размешчаны вокладкі кніг Янкі Галубовіча і анатацыі да іх.

У раздзеле **«Зборнікі»** прадстаўлены анталогіі, калектыўныя зборнікі, школьныя падручнікі, хрэстаматыі, артыкулы з перыядычнага друку, дзе друкаваліся творы Янкі Галубовіча. Часта яго творы былі размешчаны ў вядучых рэспубліканскіх выданнях – часопісах «Полымя»,

«Маладосць», «Алеся», «Родная прырода», «Вожык» і амаль што ў кожным нумары «Маладзечанскай газеты».

У раздзеле **«Слова»** размешчаны артыкулы пра Янку Галубовіча, якія друкаваліся ў перыядычных выданнях.

У раздзеле **«Рукапісы»** прыводзіцца некалькі рукапісаў абразкоў і артыкулаў Янкі Галубовіча, якія прадставіла жонка пісьменніка.

Іван Іванавіч з'яўляўся актыўным членам літаратурнага аб'яднання «Купалінка», што працавала пры «Маладзечанскай газеце». На сайце прыводзяцца сканы некалькіх старонак «Купалінкі», дзе друкаваліся творы Янкі Галубовіча.

У раздзеле **«Бібліяграфія»** – бібліяграфічны спіс артыкулаў пра Янку Галубовіча, якія друкаваліся ў перыядычных выданнях.

У раздзеле **«Меморыя»** даецца інфармацыя, прысвечаная памяці пісьменніка, а таксама друкаваная прадукцыя: брашура, закладкі, буклет.

З мэтай папулярызацыі творчасці пісьменніка сярод дзяцей і моладзі створаны раздзел **«Інтэрактыўныя гульні»**, дзе размяшчаюцца анлайн-крыжаванка, анлайн-віктарына, квэст-рум і інш.

Таксама на сайце размешчаны **«Матэрыялы да правядзення мерапрыемстваў»**, прысвечаных Янку Галубовічу: літаратурны сцэнарый, крыжаванка, медыяпрэзентацыя, квэст-гульня, поле цудаў і інш. Большая частка з іх распрацавана супрацоўнікамі аддзела маркетынгу і сацыякультурнай дзейнасці, ёсць сцэнарыі, падрыхтаваныя бібліятэкарамі, якія самі праводзілі гэтыя мерапрыемствы.

У лістападзе 2022 года адбылася прэзентацыя вітруальнага музея. У мерапрыемстве прынялі ўдзел сябры пісьменніка па творчаму цэху, педагогі, супрацоўнікі бібліятэкі, актыўныя чытачы, навучэнцы палітэхнічнага каледжа. Да вечарыны была падрыхтавана выстаўка кніг пісьменніка, якая сведчыла аб яго плённай творчасці. Цёплыя словы аб пісьменніку гаварылі пісьменнік і краязнавец Міхась Казлоўскі; пісьменнік, былы галоўны рэдактар «Маладзечанскай газеты» Аляксандр Хазянін; паэткі Тамара Бярэзіна і Ала Клемянок. Выконвалі песні на свае вершы Ала Клемянок і Марыя Шабанец. Арганічна ўпісалася ў вечарыну выступленне народнага фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Крынічанька». На вечарыне прысутнічала жонка Івана Іванавіча Яўгенія Уладзіміраўна, якая ўсё жыццё працавала настаўніцай малодшых класаў. Яна падзялілася ўспамінамі пра Івана Іванавіча, расказала, як ён збіраў матэрыял для сваіх твораў, як цалаваў кожную новую сваю кнігу, а таксама падзякавала за стварэнне віртуальнага музея і арганізацыю мерапрыемства па ўшанаванню яго памяці.

Прэзентацыя віртуальнага музея адбылася таксама: на нарадзе бібліятэкараў ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»; для ўдзельнікаў раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры; для ўдзельнікаў раённага навучальна-метадычнага аб'яднання школьных бібліятэкараў.

 

**Чаканыя вынікі:**

удасканаленне дзейнасці па выхаванні ў дзяцей і падлеткаў любові да роднага краю, духоўнаму і маральнаму выхаванню;

павышэнне цікавасці да творчасці Я. Галубовіча;

развіццё ў бібліятэках даследчыцкай дзейнасці, далучэнне да яе дзяцей і падлеткаў;

узмацненне ролі бібліятэкі ў інфармацыйным забеспячэнні карыстальнікаў у інтэрнэт-прасторы;

павелічэнне колькасці карыстальнікаў бібліятэкі;

павышэнне наведвальнасці сайта;

умацаванне партнёрскіх адносін з установамі адукацыі і культуры.

**Перспектывы далейшага развіцця рэсурсу:**

збор краязнаўчай інфармацыі, фарміраванне краязнаўчых рэсурсаў, папулярызацыя літаратурнай спадчыны рэгіёна, у прыватнасці, творчасці Я. Галубовіча, праз інтэрнэт-рэсурсы;

актывізацыя даследчыцкай дзейнасці бібліятэк, фарміраванне большай цікавасці да яе ў дзяцей і падлеткаў;

удасканаленне лічбавай дзейнасці бібліятэк, накіраванай на забеспячэнне доступу карыстальнікаў да краязнаўчых рэсурсаў бібліятэкі;

пазіцыяніраванне бібліятэкі як інфармацыйнага цэнтра для тых, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай свайго краю.

# Віртуальны музей Васіля Віткі
# «Народжаны пад знакам паэзіі»

***Варанчук Таццяна Мікалаеўна**, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка»*

Слуцкая зямля багатая гісторыяй, гераічным мінулым і самабытнай сучаснасцю, культурнай спадчынай, якая мае сваю непаўторнасць і з'яўляецца прадметам гонару яе жыхароў. Асобнае месца на літаратурным небасхіле Случчыны займае Васіль Вітка (Цімох Васільевіч Крысько) – класік беларускай дзіцячай літаратуры, адзін з лепшых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, якая прадстаўляе гісторыю і культуру нашай краіны. Наш зямляк яскрава праявіў сябе як паэт і празаік, драматург і перакладчык, казачнік і публіцыст, крытык і журналіст, першы рэдактар першага часопіса на беларускай мове для дзяцей «Вясёлка». У 2008 годзе ў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы ў рамках краязнаўчага праекта дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 3 «Слуцк – валошка ў вянку Беларусі» былі ініцыяваны і ўпершыню праведзены Майскія Віткаўскія чытанні, якія накіраваны на падтрымку чытацкай культуры, захаванне духоўнай спадчыны, беражлівых адносін да роднай мовы і літаратуры.

За гэты час штогадовыя Майскія Віткаўскія чытанні сталі сапраўдным брэндам Случчыны, прыкметнай з'явай у культурным жыцці раёна. Назапашана шмат матэрыялаў аб нашым слынным земляку, наладжаны цесныя сувязі з установамі адукацыі, бібліятэкамі, беларускімі пісьменнікамі, лаўрэатамі прэміі імя Васіля Віткі, дзяржаўнымі музеямі. Дзякуючы намаганням Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі, імя пісьменніка-земляка ўшаноўваецца ў г. Слуцку: у 2017 годзе ў названа вуліца горада, у гонар Васіля Віткі закладзены сквер.

Лагічным працягам нашай шматгадовай працы стала распрацоўка і адкрыццё з 1 лістапада 2023 года доступу для анлайн-карыстальнікаў на сайце бібліятэкі віртуальнага музея Васіля Віткі «Народжаны пад знакам паэзіі».



Асноўнай мэтай стварэння музея з’яўляецца максімальны збор фактаграфічнага, бібліяграфічнага матэрыялу, яго сістэматызацыя, фармаванне цэласнага прадстаўлення пра асобу нашага славутага земляка, яго жыццёвы і творчы шлях.

Шырокай аўдыторыі карыстальнікаў сайта прадстаўлена магчымасць аператыўнага бясплатнага доступу да значнага масіву інфармацыі пра пісьменніка-земляка.

Для стварэння віртуальнага музея была прааналізавана значная колькасць матэрыялаў: кніг, артыкулаў з газет, часопісаў, архіўных дакументаў, інтэрнэт-крыніц; праведзена работа па пошуку дакументаў, фотаматэрыялаў. Паступова быў алічбаваны і адрэдагаваны значны комплекс матэрыялаў з фондаў бібліятэкі.

Віртуальны музей Васіля Віткі «Народжаны пад знакам паэзіі» вырашыў задачу аб’яднання ў адзіным электронным рэсурсе персанальнай інфармацыі і арганізацыі доступа да яе https://sites.google.com/view/vasil-vitki-virtual-museum.

**Музей складаецца з шасці раздзелаў:**

аб праекце;
жыццёвы шлях;
аб творчасці;
літаратурная спадчына;
сцэнарыі;
ушанаванне памяці.




**Раздзел «Жыццёвы шлях» уключае тры рубрыкі:**

У рубрыцы «**Біяграфія**» ў храналагічным парадку размешчаны звесткі аб жыццёвым і творчым шляху Васіля Віткі.

Фотаздымкі асабістых дакументаў прадстаўлены ў рубрыцы **«Дакументы»**.

Рубрыка «**Фотаальбомы**»




**Раздзел «Аб творчасці**» складаецца з рубрык:

Бібліяграфічныя спісы асобных выданняў, зборнікаў, твораў пісьменніка на рускай мове, твораў у перыядычным друку размешчаны ў рубрыцы «**Бібліяграфія**».



Даследваннні творчага і жыццёвага шляху Васіля Віткі вядомымі сучаснымі беларускімі пісьменнікамі М. Чарняўскам, Р. Бензяруком, Л. Мінкевічам, У. Ліпскім і іншымі ўвайшлі ў рубрыку **«Літаратурна-крытычныя артыкулы**».

Васіль Вітка даследаваў праблемы выхавання, закранаў многія праблемы школьнага жыцця. Уся яго творчасць прасякнута пачуццём глыбокай адказнасці за выхаванне дзяцей. Ён быў пісьменнікам-педагогам, настаўнікам, выхавацелем, які быў сур’ёзна занепакоены педагагічнымі праблемамі. Усё гэта адлюстравана ў рубрыцы **«Вітка-педагог**». Тут прадстаўлены бібліяграфічныя запісы і паўнатэкставыя дакументы Я. Лаўкова, Н. Шандроха, Т. Мархель і іншых.

У рубрыцы «**Эпісталярый**» размешчаны лісты Васіля Віткі М. Лобану, Г. Бураўкіну.

Рубрыка «**Часопіс “Вясёлка”**» знаёміць карыстальнікаў з дзейнасцю пісьменніка-земляка на пасадзе першага галоўнага рэдактара часопіса, якім ён кіраваў на працягу 17 гадоў.

Раздзел «**Літаратурная спадчына**» прадстаўлены наступнымі рубрыкамі:




У рубрыцы «**Мастацкія творы**» размешчаны поўныя тэксты апавяданняў, вершаў, п’ес, паэм, твораў для дзяцей, якія знаходзяцца ў фондзе бібліятэкі.

Рубрыка «**Пераклады**» прадстаўляе Васіля Вітку як выдатнага перакладчыка на беларускую мову твораў украінскіх, англійскіх, балгарскіх, латышскіх, літоўскіх, рускіх аўтараў. Выданні твораў Васіля Віткі на польскай, літоўскай, славацкай, французскай, англійскай, малдаўскай, рускай, украінскай, узбекскай, кіргізскай, сербска-харвацкай мовах размешчаны ў рубрыцы «**Выданні на замежных мовах**».

У рубрыцы «**Хрэстаматыя. Роднае слова**» размешчаны першыя старонкі 7 раздзелаў кнігі.



У рубрыцы «**Кніга ўслых**» размешчаны агучаныя творы Васіля Віткі, якія былі запісаны супрацоўнікамі, карыстальнікамі бібліятэкі ў рамках рэспубліканскай акцыі «**Чытаем разам – чытаем па-беларуску**», краязнаўчага eye-stopper-праекта « **БібліяВОКНЫ**» і іншых.

У рубрыку «**Успаміны, эсэ**» ўвайшлі нарысы пісьменніка пра розныя старонкі яго жыцця і дзейнасці, пра сяброў і калег.

Рубрыка «**Вітка-крытык**» прадстаўляе карыстальнікам музея літаратурна-крытычныя артыкулы пісьменніка.

Раздзел «**Сцэнарыі**» прапануе педагогам, выхаваўцелям, бібліятэкарам і іншым зацікаўленым карысныя паўнатэкставыя матэрыялы метадычнай скарбонкі, якія прадстаўлены бібліяграфічным спісам і могуць быць выкарастаны падчас арганізацыі ўрокаў, заняткаў і мерапрыемстваў.

Раздзел «**Ушанаванне памяці**» ўключае наступныя рубрыкі:




«**Прэмія імя Віткі**», у якой у храналагічным парадку пададзены звесткі пра лаўрэатаў прэміі часопіса «**Вясёлка**» імя Васіля Віткі;

«**Майскія Віткаўскія чытанні»,** дзе сабраны матэрыялы аб арганізацыі і правядзенні чытанняў у ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка».

«**Творы-прысвячэнні»,** дзе размешчаны вершы Г. Міклашэвіч, А. Зэкава, В. Шніпа і іншых, прысвечаныя В. Вітку;

«**У гонар Віткі**»:










Стварэнне віртуальнага музея Васіля Віткі **«Народжаны пад знакам паэзіі»** адкрывае дадатковыя якасныя магчымасці па вывучэнні творчасці класіка дзіцячай беларускай літаратуры, нашага знакамітага земляка, а таксама спрыяе прыцягненню новых карыстальнікаў, якія цікавяцца

літаратурнай спадчынай Случчыны, забяспечвае іх абслугоўванне на больш якасным узроўні.

Звесткі аб стварэнні віртуальнага музея размешчаны на сайце Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэцы https://slucklib.by, у сацыяльных сетках «Вконтакте» https://vk.com/vkchildslucklib, «Instagram» https://www.instagram.com/detbiblioslutsk/. Выйсці на рэсурс і пазнаёміцца з матэрыяламі музея праз QR-код можна таксама з лавак сквера па вуліцы Васіля Віткі ў г. Слуцку.

3 лістапада 2023 года ў дзіцячым аддзеле Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі адбылася прэзентацыя віртуальнага музея В. Віткі.

Віртуальны музей будзе і далей папаўняцца шляхам размяшчэння ў ім новай інфармацыі аб пісьменніку, далучэннем бібліяграфічных спісаў, поўнатэкставых матэрыялаў, успамінаў людзей, якія блізка ведалі В. Вітку.

Запрашаем вас у музей Васіля Віткі і спадзяемся, што знаёмства з экспазіцыямі нашага рэсурсу будзе пазнавальным і цікавым!

## «Віртуальны літаратурны музей Міколы Нікановіча»

***Марозаў Аляксандр Генадзевіч****, метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча»*




Праца над стварэннем віртуальнага літаратурнага музея пачалася ў 2023 годзе. Абмяркоўвалася афармленне віртуальнага музея, яго структура. У 2022 годзе адзначалася 120-гаддзе з дня нараджэння пісьменніка, які быў сябрам літаратурнага аб’яднання «Маладняк» і нашым земляком. Пры пошуку матэрыялаў мы звярнуліся да музея Міколы Нікановіча ў Клянніцкай базавай школе-садзе, які прадставіў матэрыялы пра пісьменніка. Сканы гэтых матэрыялаў выкарыстоўваліся пры стварэнні музея. Яшчэ крыніцы інфармацыі – архіўныя матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

Вяльмі дапамагла пры стварэнні рэсурсу ўнучатая пляменніца пісьменніка – мясцовая паэтка Яўгенія Адамаўна Дзяркач, якая прадставіла архіўныя сямейныя дакументы і фотаздымкі.

Віртуальны літаратурны музей Міколы Нікановіча складаецца з васьмі раздзелаў.

Першы раздзел **«Летапіс жыцця»**, у якім размешчана інфармацыя пра пісьменніка, біяграфічныя звесткі.


Летапіс жыцця Нікановіч Мікола
(2(15.04.1902- кастр. 1944)

Другі раздзел **«З сямейнага альбома»**. Тут можна пазнаёміцца з фотаздымкамі сям'і пісьменніка: яго бацькоў, бабулі, сястры, пляменніцы і іншых сваякоў. Ёсць фотаздымкі, якія паказваюць сталенне пісьменніка ў розным узросце, а таксама фота яго жонкі і дачок.

Шмат раздзелаў прысвечана літаратурнай творчасці пісьменніка Міколы Нікановіча.



Маці М.Нікановіча (зправа) з сяброўкай



Бацькі М.Нікановіча

Трэці раздзел **«Літаратурны фотаархіў»** прысвечаны яго працы ў аб'яднанні «Маладняк», сустрэчам пісьменніка з вядомымі творчымі людзьмі таго часу: народным артыстам БССР Уладзімірам Галубком, венгерскім пісьменнікам-камуністам Бела Ілеш і інш. Шмат фотаздымкаў Міколы Нікановіча з яго калегамі-пісьменнікамі: П. Броўкам, А. Дударам, В. Кавалём, М. Хведаровічам. Фотаздымкі сведчаць, што яны часта збіраліся ў Нікановіча дома. Ён быў знаемы з М. Лужаніным, А. Звонакам.

Чацвёрты раздзел **«Рукапісы»** змяшчае архіўныя матэрыялы рукапісаў пісьменніка: аўтабіяграфія, напісаная рукой Нікановіча; рэцэнзіі пісьменнікаў на яго творы.



Пяты раздзел **«Літаратурная старонка»**. На дадзены момант тут змешчана адсканаванае выданне аповесці «Радасць» і апавяданне «Забабоны на вёсцы».




У шостым раздзеле **«Выданні Міколы Нікановіча»** размешчаны вокладкі некаторых кніг пісьменніка, а таксама выданняў, дзе ён друкаваўся.








Сёмы раздзел **«Памяць нашчадкаў»**. У гэтай рубрыцы віртуальнага музея захоўваюцца дакументы і матэрыялы, прысвечаныя памяці Міколы Нікановіча: вершы, літаратурныя артыкулы пра яго творчасць, творчасць яго жонкі і матэрыялы святкавання юбілейных дат пісьменніка.







Восьмы раздзел **«Бібліяграфія»**. Тут наведвальнікам літаратурнага музея прадстаўлены бібліяграфічны спіс твораў пісьменніка, а таксама артыкулаў, прысвечаных творчасці літаратара.

Трэба адзначыць, што праца над віртуальным літаратурным музеем працягваецца. Увесь час ідзе работа па пашырэнні фонда архіўных дакументаў, літаратурных і літаратурна-даследчых матэрыялаў. Працуючы над стварэннем гэтага рэсурсу хочацца спадзявацца, што ўспамін пра

жыццё і творчы шлях Міколы Нікановіча і яго спадчыннікаў будзе ўдзячнай памяццю нашчадкаў свайму земляку. Наш святы абавязак – не дапусціць, каб канула ў нябыт цікавая, складаная і трагічная гісторыя лёсу пісьменніка.

**«Гуринович Фёдор Фёдорович:**
**виртуальный кабинет писателя-земляка»**

***Саенко Юлія Васільеўна**, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка»*

Бібліятэка заўсёды выконвала ролю надзейнага дарадцы ў кніжным свеце і, каб не страціць гэту функцыю, неабходна ўлічваць запыты часу і сучаснага чытача. Сёння бібліятэка – гэта не толькі залы і кнігі, але і віртуальная прастора: сайт, блогі, групы ў сацыяльных сетках.

Нашым дасягненнем стала стварэнне ў 2020 годзе на сайце ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» віртуальнага кабінета пісьменніка-земляка Ф. Ф. Гурыновіча, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ён адзначаны Літаратурнай прэміяй імя Янкі Маўра, узнагароджаны дыпломам Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Залаты купідон», двойчы ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Саюза пісьменнікаў Беларусі і іншымі ўзнагародамі, а таксама з'яўляецца Ганаровым грамадзянінам Салігорскага раёна.

Ініцыятыва была прымеркавана да 70-годдзя пісьменніка. Творы нашага земляка – частка сучаснай беларускай літаратуры, якія сталі сапраўдным укладам у развіццё культурнага жыцця Салігоршчыны. З гэтай нагоды шырока праводзіліся мерапрыемствы, прысвечаныя яго творчасці.




Асаблівасцю віртуальнага кабінета з’яўляецца той факт, што ў яго стварэнні прымае ўдзел сам пісьменнік Фёдар Фёдаравіч Гурыновіч. Непасрэдна ім прадастаўлены тэксты для размяшчэння на сайце, фота- і відэадакументы з асабістага архіва.

Паміж бібліятэкай і пісьменнікам заключаны аўтарскі дагавор аб перадачы маёмасных правоў аўтара для выкарыстання.

Трэба адзначыць, што электронны рэсурс – візітная картка пісьменніка. У 2022 годзе Фёдар Гурыновіч прыняў удзел у аўтарскай праграме Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы», якая выйшла на

Нацыянальным канале «Беларусь 3». У рэпартажы былі выкарыстаны матэрыялы, змешчаныя на сайце. Падчас інтэрв'ю пісьменнік акцэнтаваў увагу аб значнасці бібліятэкі ў яго творчасці і важнасці віртуальнага кабінета.

Віртуальны кабінет складаецца з 8 рубрык, якія змяшчаюць біяграфічную, фактаграфічную, бібліяграфічную, графічную інфармацыю, аўдыё- і відэаматэрыялы.

У рубрыку **«Біяграфія»** ўвайшла прадмова **«Замест біяграфіі»** да кнігі **«Мой храм»**, прадстаўленая самім Фёдарам Фёдаравічам. Тут ён пазначыў галоўныя, на яго думку, падзеі ў жыцці і творчасці.




Матэрыялы, размешчаныя ў віртуальным кабінеце, ахопліваюць розныя бакі шматграннага жыцця і творчай дзейнасці нашага земляка.

Асабліва каштоўнай з’яўляецца падрубрыка **«Успаміны»**, дзе пісьменнік ўзгадвае пра сустрэчы з землякамі, якія ўнеслі ўклад у развіццё нашага раёну. Гэта артыкулы пра сустрэчы з Максімам Лужаніным, Аляксеем Кулакоўскім, Валянцінай Аколавай, якія з’яўляюцца літаратурным гонарам Салігоршчыны. Размешчаны ўспаміны аб сустрэчах са знакамітымі пісьменнікамі Рыгорам Барадуліным, Казімірам Камейшам, з народным артыстам Расіі Мікалаем Карачанцавым.

Падрубрыка **«Узнагароды»** дае магчымасць ацаніць творчую актыўнасць, літаратурны ўклад, грамадскую дзейнасць пісьменніка і Ганаровага грамадзяніна Салігорскага раёна Ф. Гурыновіча.




Акрамя пісьменніцкага таленту, у Фёдара Фёдаравіча ёсць сапраўдная любімая справа, якой ён прысвячае ўвесь свой вольны час. Аб гэтай цікавай старонцы жыцця можна даведацца ў рубрыцы **«Свет захапленняў»**. Лес – стыхія пісьменніка, паляванне – асалода ў жыцці, рыбалка – хобі. Яднанне з прыродай становіцца творчай лабараторыяй, якая нараджае новыя творы, стварае незабыўныя вобразы.

**«Цікавыя факты»** – падрубрыка, зрабіць якую было складана, але бібліятэкары пастараліся і адшукалі шмат цікавых звестак аб жыцці і творчасці пісьменніка. Напрыклад, вы даведаецеся, што наш паэт валодае талентам мастака. У біяграфіі ёсць згадка, што ён маляваў партрэты Гётэ, Шылера, Гейнэ.




У рубрыцы **«Творчасць»** сабраны звесткі пра творы пісьменніка, крытычныя артыкулы, агляд літаратурнай дзейнасці і іншыя матэрыялы. Для зручнасці карыстальнікаў матэрыял размясцілі ў падрубрыках. Каштоўнай з’яўляецца магчымасць пазнаёміцца з новымі вершамі, зборнік якіх яшчэ толькі рыхтуецца да выдання. Праз падрубрыку «Новыя вершы аўтара» можна сачыць за развіццём літаратурнай творчасці паэта. Усе творы пісьменніка змешчаны ў падрубрыцы **«Храналогія выхаду твораў»**. Звяртае ўвагу падраздзел **«Выбранае»**. З дазволу аўтара ў ім змешчаны ў электронным фармаце кнігі **«Позднее яблоко»** і **«Мой храм»**. Асаблівасцю падрубрыкі **«Літаратурна-крытычныя артыкулы»**

з'яўляецца падзел на поўнатэкставыя артыкулы і спіс артыкулаў. **«Метадычныя рэкамендацыі»**, **«Сцэнарыі»**, **«Мерапрыемствы»** – падрубрыкі, назвы якіх гаворацць самі за сябе. Тут змяшчаны матэрыялы, складзеныя бібліятэкарамі, сабраны фотаздымкі і тэлерэпартажы мінулых мерапрыемстваў, створаных па творчасці ці з удзелам Фёдара Гурыновіча.

Вылучана падрубрыка **«Сеткавыя акцыі»**, у якой прадстаўлены анлайн-мерапрыемствы, арганізаваныя на сайце і ў сацыяльных сетках раённай цэнтральнай бібліятэкі. Гэты напрамак накіраваны на папулярызацыю творчасці пісьменніка-земляка ў віртуальнай прасторы, прыцягненне карыстальнікаў да актыўнай творчасці. Асаблівасць такой дзейнасці – вялікі ахоп аўдыторыі. Напрыклад, для ўдзелу ў акцыі **«Чытаць Гурыновіча – пасцігаць Салігоршчыну»** 12 удзельнікаў стварылі 26 відэаролікаў (1639 наведванняў на сайт бібліятэкі). Фотаконкурс **«Неверагодныя прыгоды з Фёдарам Гурыновічам»** зацікавіў 50 удзельнікаў, якія прадставілі больш за 60 ілюстрацый да вершаў (554 наведванні). У акцыі **«З кнігай на колах»** з творчымі фотаздымкамі, аздобленымі каментарыямі, удельнічалі больш за 70 чалавек (655 наведванняў). У анлайн-галасаванні **«З любоўю да роднага краю»** былі прадстаўлены 62 малюнкі, за якія было аддадзена 10 632 галасы. Актыўная дзейнасць у межах ініцыятыў мела ўвогуле больш за 13 000 зваротаў да віртуальнага рэсурсу.

Па выніках анлайн-мерапрыемстваў заўсёды праходзяць яркія выніковыя імпрэзы ў рэальным фармаце, узнагароджваюцца ўдзельнікі і пераможцы.

Прачытанне ўласных вершаў Фёдарам Гурыновічам у рубрыцы **«Чытае аўтар»** дазваляе глыбей зразумець думкі і пачуцці пісьменніка, адказаць на пытанні пра змест прачытанага. Вершы прасякнуты любоўю да Радзімы, а аўтарскае чытанне дазваляе зразумець эмоцыі паэта.

Рубрыка **«Галерэя»** змяшчае фота- і відэаматэрыялы, у тым ліку, і рэдкія здымкі з асабістага архіва, мастацкія фатаграфіі прыроды, зробленыя пісьменнікам.

Вялікі ўклад пісьменнік унёс у выхаванне маладога пакалення. Яго кнігі для дзяцей пазнавальна і займальна распавядаюць пра прыроду, вучаць любіць сваю родную Салігоршчыну, раскрываюць яе таямніцы і адметныя рысы, якія ўласцівы толькі нашаму раёну.

Вядома, мы не маглі не вылучыць тую частку літаратурнай творчасці, якая датычыцца Салігоршчыны, і сабралі матэрыял у рубрыцы **«Слова аб зямлі Салігорскай»**. Тут размешчана паэма **«Шахцёрскія зоркі»**.

На паэтычныя творы нашага земляка складзены песні кампазітарамі Л. Захлеўным, А. Аверыным, Э. Зарыцкім, А. Елісеенкавым і іншымі. Яны сабраны ў рубрыцы **«Песні на вершы Ф. Гурыновіча»**.

Фёдар Фёдаравіч сціплы і шчодры чалавек. Ён падараваў раённай цэнтральнай бібліятэцы калекцыю кніг з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў. У рубрыцы **«Аўтограф на памяць»** размешчаны

прэзентацыі аб гэтых кнігах і кнігах з аўтографамі самога Гурыновіча, якія ён падпісаў бібліятэцы і яе чытачам. Сёння яны складаюць фонд каштоўных выданняў нашай установы.

У віртуальным кабінеце створана рубрыка для дзяцей **«Літаратурны нон-стоп»** па выданні Ф. Ф. Гурыновіча «Спасибо солнышку» – выдатны свет дзяцінства. Усё ў ёй ад «А» да «Я» напісана аб прыродзе, кожнае імгненне аўтар прадбачыў, адчуў на сабе. Змест кнігі падаецца ў сучасным фармаце: размешчаны апавяданні, вершы аўтара, ілюстрацыі. Да іх прыкладаюцца віртуальныя гульні. Тут на любы густ можна знайсці пазлы, крыжаванкі, загадкі, тэзаўрус. У выніку юныя карыстальнікі атрымліваюць новую тэкставую інфармацыю, праяўляюць свае інтэлектуальныя і творчыя здольнасці. Хочацца адзначыць, што для дзіцяці рэсурс просты ў звароце і даступны ў карыстанні.

Галоўная задача стварэння электроннага рэсурсу – знаёмства з жыццём і творчасцю пісьменніка-земляка. Бібліятэкары праводзяць вялікую работу па прасоўванні творчасці Ф. Гурыновіча, распаўсюджваюць інфармацыю пра магчымасці электроннага прадукту праз правядзенне акцый па стварэнні відэаролікаў, фотаконкурсу, конкурсу ілюстрацый да твораў, мерапрыемстваў краязнаўчай тэматыцы, прысвечаных пісьменніку. Створаны банер, які інфармуе пра рубрыкі і змест кабінета, рэкламны буклет, яркія зручныя флаеры, якія бібліятэкары прапануюць наведвальнікам. Вядзецца распаўсюджванне інфармацыі праз медыя. Шырока выкарыстоўваюцца магчымасці сацыяльных сетак, размяшчаюцца пасты ў Telegram-канал галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта «Культурныя людзі Міншчыны». Артыкулы размяшчаюцца ў перыядычных выданнях, электронных рэсурсах ДУ «Рэдакцыя газеты «Шахцёр» «Інфармацыйны партал Салігорскага рэгіёна». Карэспандэнты вытворчага камунальнага унітарнага прадпрыемства «Салігорскі тэлевізійны канал» ствараюць відэасюжэты, якія расказваюць пра дзейнасці бібліятэкараў. За 2023 год было створана 3 публікацыі ў мясцовых перыядычных выданнях, 2 рэпартажы на інфармацыйным партале Салігорскага рэгіёна, 3 відэасюжэты прайшлі на Салігорскім тэлевізійным канале.

Звесткі аб віртуальным кабінеце размешчаны на сайце ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна» ў раздзеле «Электронныя краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк Мінскай вобласці», а таксама на афіцыйным сайце «Зводны электронны каталог бібліятэк Мінскай вобласці» ў раздзеле «Краязнаўчыя базы даных бібліятэк Мінскай вобласці».

Раённая цэнтральная бібліятэка ў вачах салігарчан, кіраўніцтва Салігорскага раёна, літаратараў асацыюецца з творчасцю пісьменніка-земляка і мае магчымасць папулярызаваць яго творы, а бібліятэкары атрымалі зацікаўленага партнёра-пісьменніка, які актыўна рэкламуе і выкарыстоўвае рэсурс. Праца над віртуальным кабінетам працягваецца, ён рэгулярна папаўняецца новымі матэрыяламі.

## Віртуальная старонка пра паэта, празаіка і публіцыста Міхася Парахневіча

***Батура Вольга Юр'еўна**, намеснік дырэктара ДУ «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка»*

Віртуальная старонка сабрала ў сабе ўсю інфармацыю пра пісьменніка: біяграфію, яго творчасць, фатаграфіі і ўзнагароды.




На сайце, акрамя галоўнай старонкі, размешчана 7 раздзелаў.

Галоўная старонка. На банеры размяшчаецца партрэт пісьменніка, крыху ніжэй – кароткая характарыстыка Міхася Прохаравіча: «паэт, празаік, публіцыст і аўтар твораў для дзяцей і моладзі», потым ідзе верш пра Старыя Дарогі, малую радзіму пісьменніка, і 7 спасылак у выглядзе «клікабельных» кнопак-малюнкаў. Унізе старонкі (як і кожнага раздзела) размяшчаецца інфармацыя аб Старадарожскай бібліятэцы (назва, адрас, спасылка на афіцыйны сайт).

Раздзел **«Біяграфія»**. Пад загалоўкам размяшчаецца кнопка ў выглядзе схематычнай хаткі, якая вядзе на галоўную старонку (такія кнопкі прысутнічаюць у кожным з частак). Ніжэй напісана біяграфія пісьменніка: гады жыцця, вучоба, праца.




Раздзел **«Рэцэнзіі».** У дадзеным раздзеле можна прачытаць рэцэнзію Міколы Гіля «Проза Міхася Парахневіча», дзе распавядаецца пра творчасць пісьменніка.




Раздзел **«Узнагароды»** . На старонцы можна знайсці граматы, якімі быў узнагароджаны Міхась Парахневіч, а таксама копіі віншаванняў з 50-годдзем ад яго блізкіх.




Раздзел **«Апавяданні»** . На старонцы прадстаўлены апавяданні, якія былі надрукаваны ў розных выданнях – часопісах і газетах.

Раздзел **«Фотаздымкі»**. У раздзеле прадстаўлена некалькі фотаздымкаў пісьменніка, якія былі надрукаваны ў кнігах Міхася Прохаравіча.

Раздзел **«Літаратура»**. У ім можна знайсці ўсе кнігі аўтара, якія знаходзяцца ў фондах Старадарожскай цэнтральнай бібліятэкі, а таксама тыя кнігі, дзе напісана пра паэта.



Раздзел **«Вершы»**. На старонцы прадстаўлены выбраныя вершы аўтара, з якімі можна азнаёміцца.

У 2024 годзе ў бібліятэцы будзе адзначацца 90-годдзе з дня нараджэння Міхася Парахневіча, таму віртуальная старонка стане цудоўным дадаткам для правядзення мерапрыемстваў, бо на ёй сабрана ўся інфармацыя пра пісьменніка, якая будзе папаўняцца па меры паступлення новай магчымай інфармацыі.

На саму віртуальную старонку можна зайсці з афіцыйнага сайта Старадарожскай бібліятэкі. На галоўнай старонцы справа ў каруселі размешчаны банер з партрэтам Міхася Парахневіча са спасылкай на віртуальную старонку.

Спасылка на віртуальную старонку: https://sites.google.com/view/ktsvirka-std/галоўная-старонка?authuser=0.

## «Віртуальны музей Паўлюка Труса»

***Драчан Аксана Валер'еўна,*** *дырэктар*
*ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса»*

Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса – адукацыйна-культурны цэнтр, сховішча актуальнай інфармацыі, месца вольнага часу і зносін чытачоў рознага ўзросту.

Адным з прыярытэтных напрамкаў работы бібліятэкі з'яўляецца літаратурнае краязнаўства. Прыцягальнасць краязнаўчых літаратурных даследванняў менавіта ў тым, што чым больш паглыбляешся ў іх, тым ярчэй выяўляецца асоба чалавека, пра якога хочацца паведаміць іншым.

Раённая бібліятэка носіць імя П. Труса з 1960 года. За гэты час было многа зроблена па ўшанаванні памяці паэта, сабрана шмат цікавых краязнаўчых матэрыялаў, дакументаў, рарытэтных выданняў твораў паэта.

У мэтах прасоўвання літаратурнай краязнаўчай спадчыны сярод карыстальнікаў раённай бібліятэкі быў створаны віртуальны музей нашага земляка, беларускага паэта Паўлюка Труса.

У віртуальнай экспазіцыі размясціліся самыя цікавыя, разнастайныя матэрыялы аб жыцці і літаратурнай дзейнасці паэта, успаміны аб ім, аўдыяматэрыялы, перапіска паэта з сябрамі і роднымі.

Размяшчэнне музея на сайце раённай бібліятэкі паказала, што інтарэс да творчасці паэта значна ўзрос сярод карыстальнікаў.




У выніку работы экспазіцыя музея склалася з 15 раздзелаў, у ёй выкарыстаны дакументы і фотаздымкі з архіва раённай бібліятэкі, фотаздымкі з экспазіцыі Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацва.

Мы вырашылі прадставіць увесь спектр жыцця і творчасці нашага паэта-земляка Паўлюка Труса ў фармаце віртуальнага музея, каб як мага больш карыстальнікаў бібліятэкі змаглі даведацца пра вядомага паэта.

Кароткае жыццё было наканавана П. Трусу, на яго літаратурную дзейнасць прыйшлося ўсяго 6 гадоў, аднак ён паспеў пакінуць адметны след у беларускай літаратуры, яшчэ пры жыцці, стаўшы яе класікам.

Невялікая характарыстыка некаторых раздзелаў экспазіцыі віртуальнага музея П. Труса:




**«Дзіцячыя гады»** – у гэтым раздзеле экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы ўспамінаў аднавяскоўцаў аб дзіцячых гадах паэта, успаміны самога Паўлюка Труса, фотаздымкі родных, асабістыя рэчы паэта з экспазіцыі Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея.

**«І пайшоў я ў свет…»** – з гэтага раздзела наведвальнікі віртуальнага музея даведаюцца аб школьных гадах паэта: вучобе ў пачатковай школе, а затым у Уздзенскай сямігодцы, пра дзіцячае і юнацкае сяброўства будучых вядомых літаратараў Беларусі П. Труса, П. Глебкі, А. Якімовіча… «Іх яднала ў дружбе любоў да мастацкага слова, жаданне самастойна разведаць чароўную сілу яго казачнай прыгажосці. І ён (Паўлюк) ім першым паказаў свае нясмелыя спробы пяра – вершы, напісаныя пад уплывам творчасці класікаў рускай і беларускай літаратуры». Тут жа размешчаны і матэрыялы пра пачатк літаратурнай творчасці паэта.

**«Жыцця маладога дарога»** – у гэтай частцы экспазіцыі матэрыялы пра вучобу П. Труса ў Мінскім белпедтэхнікуме і Беларускім дзяржаўным універсітэце, на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта. Раздзел ахоплівае перыяд з 1923 па 1928 гады і напоўнены фотаздымкамі, дакументамі, пісьмамі і ўспамінамі сучаснікаў паэта, тымі, хто вучыўся разам з ім у гэтых навучальных установах.

**Адметны факт: у перыяд вучобы ў БДУ П. Трусу давялося вывучаць сваю творчасць!**

Адзін з важных у жыцці і творчасці паэта перыяд адлюстраваны ў раздзелах **«Новы этап ў жыцці – «Маладняк»** і **«Маладняк ці Узвышша»?** Гэтыя старонкі віртуальнай экспазіцыі прысвечаны дзейнасці П. Труса ў літаб’яднаннях «Маладняк» і «Узвышша». На гэты перыяд прыйшоўся і ўзлёт творчасці паэта. На старонках гэтых раздзелаў размешчаны фотаздымкі таго часу, дакументы, успаміны сяброў паэта, сучаснікаў, аўтографы вершаў Паўлюка Труса.

Бадай што самы цікавы раздзел нашай віртуальнай экспазіцыі **«Кумір беларускай моладзі».** Якой жа асобай быў малады таленавіты беларускі паэт? Убачыць Паўлюка Труса такім, якім ён быў у жыцці, нам дапамаглі ўспаміны яго сяброў, знаёмых, аднакурснікаў, паплечнікаў, тагачасныя фотаздымкі паэта. Невялічкі ўрывак з успамінаў Максіма Лужаніна: «Паўлюк любіў жыццё, любіў людзей, сыходзіўся з імі вельмі лёгка і шчыра…Умеў зачараваць прысутных сваімі вершамі, чытаў іх з майстэрствам артыста-чытальніка. Голас у Паўлюка быў звонкі, чытаў ён амаль усё па памяці, чым здзіўляў сваіх слухачоў».

Наступны раздзел – **«На сцежках славы».** У гэтым раздзеле экспазіцыі таксама можна ўбачыць рэдкія фотаздымкі пахавання паэта, прачытаць успаміны яго сяброў, сведкаў тых журботных падзей. Для беларускай літаратуры гэта была вялікая страта…

Самы вялікі раздзел віртуальнай экспазіцыі – **«Ушанаванне памяці»**. Хочацца прыгадаць эпіграф гэтай віртуальнай старонкі – словы П. Глебкі, якія раскрываюць змест экспазіцыі: «Увага да творчасці Паўлюка Труса можа прытухаць і разгарацца зноў, але згаснуць зусім яна не можа». У гэтым раздзеле – лісты пісьменнікаў і краязнаўцаў, рукапісы твораў паэтаў і празаікаў, прысвечаныя П. Трусу, рарытэтныя кнігі Трусаўскага фонду, фотаздымкі асабістых рэчаў П. Труса з экспазіцыі Уздзенскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, фотаздымкі з розных мерапрыемстваў, прысвечаных паэту. Тут размешчана інфармацыя аб мультымедыйных прэзентацыях, віктарынах-конкурсах па творчасці паэта, днях памяці, літаратурных імпрэзах. Карыстальнікі могуць




даведацца аб удзеле бібліятэкі ва Узвышаўскіх чытаннях у 2004 і 2023 гг., а таксама паглядзець відэаролік «Тут слова Труса гучыць, не змаўкае», які быў прадстаўлены на навукова-практычным семінары «Ураджэнцы роднага краю», што адбыўся на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (2022 г.).



Раздзелы **«Мы прыходзім у свет, каб уславіць яго…», «На прасторах творчасці», «Чытацкая вернасць»** напоўнены матэрыяламі аб літаратурнай дзейнасці паэта, рэпрадукцыямі малюнкаў мастакоў. Тут таксама размешчаны франтыспісы вокладак кніг з яго творамі і бібліяграфія паэтычнай спадчыны.

Раздзел **«Ой, вёска, вёска пры гасцінцы…»** прысвечаны вёсцы Нізок, радзіме П. Труса. Ён уключае цікавыя архіўныя фотаздымкі, рэпрадукцыі карцін мастакоў Ткачовых, якія пэўны час жылі ў вёсцы, архіўную інфармацыю аб вядомых асобах, ураджэнцах в. Нізок.

Па ініцыятыве пляменніцы Паўлюка Труса Марыі Міхайлаўны Крупнік пры ўездзе ў вёску Нізок установлены інфармацыйны стэнд (01.10.2022), які прысвечаны памяці Паўлюка Труса і іншых знакамітых ураджэнцаў з вёскі Нізок. Стэнд быў распрацаваны супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання і інфармацыі раённай бібліятэкі.

У выніку работы па прагандзе жыцця і творчасці Паўлюка Труса з кожным годам удасканальваецца, папаўняецца новымі матэрыяламі інфармацыйны рэсурс «Віртуальны музей П. Труса», што прыцягвае ўвагу новых віртуальных карыстальнікаў не толькі з Беларусі, але і з замежных краін. Вырасла ўжо не адно новае пакаленне чытачоў. Але і зараз ёсць прыхільнікі паэзіі П. Труса, жыццё і творчасць якога не пакідае іх абыякавымі. І таму віртуальны музей паэта будзе яшчэ не адзін год запатрабаваны нашымі карыстальнікамі.

## «Віртуальны музей Максіма Багдановіча»

***Лаўрык Таццяна Анатольеўна,*** *загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»*

Электронны рэсурс змяшчае інфармацыю пра жыццё і творчую дзейнасць класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіч (1891–1917), папулярызацыю яго творчасці ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна (далей – Мінская абласная бібліятэка) ў рамках праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» (2022–2023).

Перайсці ў музей можна на старонцы сайта бібліятэкі https://pushkinka.by/, дзе знаходзіцца банер музея https://sites.google.com/view/bogdanovich-virtual-museum.

Матэрыялы для музея былі падрыхтаваны Мінскай абласной бібліятэкай сумесна з Літаратурным музеем Максіма Багдановіча (філіялам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры) і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва.




У межах інфармацыйнага рэсурсу створаны раздзелы, якія змяшчаюць звесткі пра біяграфію пісьменніка, цікавыя факты з яго жыцця, унікальныя фотаздымкі і сканы рукапісаў з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча і Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, поўныя тэксты матэрыялаў сучасных даследчыкаў пра творчасць пісьменніка.

Віртуальны музей налічвае 8 раздзелаў, якія аформлены ў адзіным стылі. Адразу пры пераходзе ў музей вы трапляеце на галоўную старонку, дзе змяшчаюцца назвы раздзелаў, застаўка музея, а таксама інтэрактыўнае фота Максіма Багдановіча, які ўсміхаецца наведвальнікам рэсурсу. Тут можна пазнаёміцца з кароткай біяграфічнай даведкай пра пісьменніка і адным з самых вядомых вершаў Максіма Багдановіча – рамансам «Зорка Венера».



У раздзеле **«Біяграфія»** прадстаўлены матэрыял аб жыцці і творчасці пісьменніка. У гісторыі беларускай літаратуры Максіму Багдановічу належыць пачэснае месца. Імя яго стаіць побач з імёнамі такіх класікаў беларускай і сусветнай літаратуры, як Янка Купала і Якуб Колас. Яго творчая спадчына – істотная частка духоўнай культуры беларускага народа. Максім Багдановіч стаіць у шэрагу тых піянераў беларускага нацыянальнага адраджэння, хто спрабаваў паказаць месца і ролю беларускага народа ў гісторыі і часе, сфармуляваць нацыянальную ідэю беларусаў, асэнсаваць шляхі далейшага развіцця беларускай нацыі. Унікальнасць і веліч асобы і творчай постаці паэта сцвярджаюць слушнасць званняў «гарачае сэрца», верны рыцар бацькаўшчыны, пясняр Беларусі, якія надалі яму сучаснікі і нашчадкі. Творчую спадчыну Максіма Багдановіча вывучае адна з галін беларускай літаратурнай навукі – багдановічазнаўства.

Другі раздзел **«Творчасць»** прысвечаны выданням Максіма Багдановіча, якія ёсць у фондах Мінскай абласной бібліятэкі.

Яго творы неаднаразова выпускаліся асобнымі выданнямі, друкаваліся ў сродках масавай інфармацыі. Збор твораў паэта ў двух тамах выходзіў у Мінску ў 1927–1928 гг. і ў 1968 г. Поўны збор твораў у трох тамах выдадзены ў Мінску ў 1992–1995 гг. і ў 2001 г. У 1927 г. у Вільні з’явілася 2-е выданне зборніка «Вянок», таксама выходзілі факсімільныя выданні гэтага зборніка.

У раздзеле прадстаўлены вокладкі кніг, бібліяграфічныя запісы і кароткія анатацыі да кніг з фондаўМінскай абласной бібліятэкі.

Раздзел **«Крытыка»** змяшчае інфармацыю пра літаратуразнаўчыя даследаванні жыцця і творчасці паэта. Тут таксама можна пазнаёміцца з кнігамі пра Максіма Багдановіча з фондаў Мінскай абласной бібліятэкі. У тым ліку, прадстаўлены падраздзелы **«Артыкулы з кніг», «Артыкулы з перыядычных выданняў», «Максім Багдановіч – дзецям**», якія змяшчаюць 620 аналітычных бібліяграфічных запісаў на дакументы з нашых фондаў у рамках багдановічазнаўства. З дазволу асобных даследчыкаў творчасці пісьменніка (на сёння – загадчыка Літаратурнага

музея Максіма Багдановіча Міхаіла Бараноўскага і вядучага навуковага супрацоўніка музея Ірыны Мышкавец) у віртуальным музеі размешчаны іх поўныя тэксты артыкулаў з перыядычных выданняў (36 публікацый) у адкрытым доступе.




Раздзел **«Галерэя»**. Тут прэзентаваны матэрыялы з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча (фатаграфіі, рукапісы, кнігі, дакументы, дароўныя надпісы, зробленыя рукой Максіма Багдановіча); з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва – лісты галоўнага бібліёграфа аддзела беларускай літаратуры Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна (сёння Нацыянальная бібліятэка Беларусі) Ніны Барысаўны Ватацы да стрыечнага брата Максіма Адамавіча Паўла Багдановіча і іншае.






*Аўтограф і дароўны надпіс. З фондаў ЛММБ*

Наступны раздзел **«Цікавыя факты»** паведамляе пра сусветнае празнанне творчасці песняра Беларусі. Тут распавядаецца пра месцы, звязаныя з Максіма Багдановічам. У Мінску, у Траецкім прадмесці, знаходзіцца Літаратурны музей Максіма Багдановіча. Акрамя таго, у Мінску захаваўся дом, у якім жыў Максім Багдановіч (вуліца Рабкораўская, 19), дзе размешчаны філіял яго музея – «Беларуская хатка» (па назве аднайменнага нацыянальнага клуба, у рабоце якога ўдзельнічаў паэт). Другі філіял музея – «Фальварак Ракуцёўшчына», дзе гасцяваў Багдановіч і напісаў два цыклы вершаў, знаходзіцца ў Маладзечанскім раёне Мінскай вобласці. Музеі класіка беларускай літаратуры таксама працуюць у Гродне і ў Яраслаўлі.



*Літаратурны музей Максіма Багдановіча ў Мінску па вул.М. Багдановіча, 7а*

Таксама раздзел змяшчае ўспаміны пра пісьменніка класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулі і беларускай пісьменніцы, грамадскага дзеяча Зоські Верас.

Раздзел **«Ушанаванне памяці»** распавядае пра правядзенне самых розных мерапрыемстваў па папулярызацыі творчасці Максіма Багдановіча ў Мінскай абласной бібліятэцы. Самым яркім з іх з’яўляецца правядзенне

Міжнароднага анлайн-конкурсу чытальнікаў «Пад зоркай Венеры» (01.12. 2022–20.12.2022) для дзяцей да 18 гадоў.

Арганізатарам конкурсу выступіла Мінская абласная бібліятэка сумесна з партнёрамі: Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Літаратурным музеем Максіма Багдановіча, Выдавецкім домам «Звязда» (газетай «Літаратура і мастацтва»), Мінскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам юнага гледача, Каналам «Культура» Беларускага радыё, Прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. Усяго налічвалася каля 1800 удзельнікаў з Беларусі і бліжэйшага замежжа, таму конкурс і набыў статус міжнароднага. Усе працы ўдзельнікаў размешчаны на ютуб-канале Мінскай абласной бібліятэкі, з асобнымі працамі можна пазнаёміцца ў рамках віртуальнага музея.



Апошні раздзел **«Пра праект»** падае кароткую інфармацыю пра віртуальны музей і яго напаўненне, а таксама знаёміць з літаратурна-краязнаўчым абласным праектам «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю», які ажыццяўляўся ў канцы 2022–2023 гг. у публічных бібліятэках Мінскай вобласці.

Прэзентацыя віртуальнага музея Максіма Багдановіча адбылася 18 снежня 2023 года ў Мінскай абласной бібліятэцы. Мерапрыемства было арганізавана сумесна з Літаратурным музеем Максіма Багдановіча і Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва. Таксама інфармацыя пра музей падавалася на шматлікіх лекцыях для слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва. Папулярызаваўся ён у артыкулах перыядычных выданняў, на Міжнародным навукова-практычным семінары «Библиотека как социально-коммуникативный институт общества» (27.02.2024), XX Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях (18.04.2024–19.04.2024), Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Развитие кадрового потенциала библиотек Российской Федерации в условиях цифровой экономики» (25.04.2024) і іншых мерапрыемствах.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар
дзяржаўнай установы
«Мінская абласная бібліятэка
імя А.С.Пушкіна»
Н.М.Вашчыла
13.03.2023

ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага музея на сайце бібліятэкі ў рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю»

1. Дадзенае палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу (віртуальнага музея, кабінета ці літаратурнай старонкі) на сайце бібліятэкі ў рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» (далей – конкурс).

2. Конкурс арганізуецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (Глава 18), Статутам дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна» (далей – Мінская абласная бібліятэка) з мэтай умацавання і развіцця супрацоўніцтва публічных бібліятэк і музеяў Мінскай вобласці пры рэалізацыі абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю».

3. Арганізацыя і правядзенне конкурсу ажыццяўляецца Мінскай абласной бібліятэкай.

4. Конкурс з’яўляецца адкрытым і праводзіцца ў перыяд з 15.03.2023 г. па 15.11.2023 г.

5. МЭТЫ КОНКУРСУ:

умацаванне супрацоўніцтва публічных бібліятэк і музейных устаноў Мінскай вобласці;

садзейнічанне духоўнаму, маральнаму, інтэлектуальнаму развіццю падлеткаў і моладзі;

далучэнне дзяцей і моладзі да даследчыцкай дзейнасці па зборы дакументальных матэрыялаў па творчасці пісьменнікаў;

захаванне гістарычнай памяці, выхаванне ў дзяцей і моладзі гонару за краіну;

стварэнне ўмоў для якаснай інфармацыйнай падтрымкі навучэнцаў;

прасоўванне кніг і чытання;

папулярызацыя інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

6. ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ:

выяўленне і падтрымка лепшых віртуальных рэсурсаў, створаных для ўшанавання памяці і папулярызацыі творчасці пісьменнікаў-землякоў, якія нарадзіліся на тэрыторыі Мінскай вобласці;

фарміраванне ў бібліятэкараў навыкаў праектнай дзейнасці і паспяховай работы ў супрацоўніцтве з музейнымі ўстановамі і пісьменнікамі-землякамі;

прыцягненне ўвагі шырокай аўдыторыі да вывучэння беларускай літаратуры, да пазнання нацыянальных культурных каштоўнасцей;

павелічэнне чытацкай цікавасці да кніжнай культуры, фондаў раённых бібліятэк і музеяў, інтэрнэт-рэсурсаў устаноў культуры;

фарміраванне аблічча бібліятэкі як месца, дзе кожны жыхар зможа знайсці дапамогу і адказ на пытанні, якія датычацца гісторыі малой радзімы;

развіццё інфармацыйных рэсурсаў раённых бібліятэк у інтэрнэт-прасторы.

7. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАРАДАК ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ:

7.1. Конкурс з’яўляецца адкрытым, праводзіцца з 15 сакавіка 2023 г. па 15 лістапада 2023 г. Экспертная ацэнка матэрыялаў рэалізаванага праекта і падвядзенне вынікаў конкурсу – да 15 снежня 2023 г.

7.2. У конкурсе прымаюць удзел публічныя бібліятэкі Мінскай вобласці ў намінацыі «Лепшы віртуальны рэсурс пра пісьменніка-земляка».

7.3. Арганізацыю і правядзенне конкурсу забяспечвае арганізацыйны камітэт (Дадатак 1), падводзіць вынікі конкурсу журы (Дадатак 2).

7.4. Кансультаванне па ўзнікаючых пытаннях аказваюць сябры журы (кантакты на сайце Мінскай абласной бібліятэкі ў раздзеле «Структура бібліятэкі»).

8. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА АФАРМЛЕННЯ І ПРАДСТАЎЛЕННЯ ІНФАРМАЦЫІ ПРА ВІРТУАЛЬНЫ РЭСУРС:

8.1. Конкурсныя матэрыялы падаюцца ў аддзел бібліятэказнаўства Мінскай абласной бібліятэкі да 15.11.2023 г.

8.2. Фарматы прададзеных матэрыялаў:

віртуальны музей;

віртуальны кабінет ці віртуальная старонка.

Рэсурс павінен быць апублікаваны на інфармацыйным сайце раённай бібліятэкі да 01.11.2023 за асобным банерам.

Конкурсныя матэрыялы ўключаюць наступныя дакументы:

заяўка для ўдзелу ў конкурсе (Дадатак 3);

тлумачальная запіска (назва, звесткі пра аўтараў праекта, інфармацыя пра віртуальны рэсурс, яго раздзелы і вопыт практычнага выкарыстання: правядзенне мерапрыемстваў, прэзентацый; чаканыя вынікі і сацыяльны эфект; перспектывы далейшага развіцця рэсурсу; дадаткі:

бібліяграфічныя запісы на публікацыі пра рэсурс у друкаваных і электронных крыніцах за 2023 г. (пры наяўнасці);

*Патрабаванні да афармлення тлумачальнай запіскі: тэкст набраны ў тэкставым рэдактары Microsoft Word, шрыфт – Times New Roman, памер – 14, інтэрвал адзінарны. Тэкст не павінен перавышаць 7 старонак.*

прэзентацыя рэсурса ў PowerPoint, якая расказвае пра рэсурс і ўтрымлівае тэкставы, фота-, відэа-, аўдыяматэрыялы і г.д., агульным аб'ёмам – не больш за 30 слайдаў, а таксама спасылку на рэсурс на сайце бібліятэкі.

9. АСНОЎНЫЯ КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ КОНКУРСНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ:

9.1. Змест:

паўната і лагічнасць адбору матэрыяла для рэсурса;

унікальнасць адлюстраваных матэрыялаў;

арыгінальнасць і творчы падыход;

рэпрэзентатыўнасць і змястоўнасць, якая выключае скажэнне фактаў;

наяўнасць матэрыялаў музейных устаноў, выкарыстаных у рэсурсе.

спосабы далучэння да стварэння рэсурсу дзяцей і моладзі.

9.2. Афармленне:

лагічнасць і паслядоўнасць падачы інфармацыі;

эрганамічнасць і візуальная зручнасць успрымання інфармацыі;

эстэтыка афармлення, адзінства стылю і дызайна;

якасць фота і адсканаваных матэрыялаў, наяўнасць подпісаў пад матэрыяламі з указаннем крыніцы інфармацыі.

9.3. Функцыянальнасць і тэхнічныя характарыстыкі:

сістэма навігацыі;

прастата карэкціроўкі і актуалізацыя звестак;

інтэрактыўны рэжым працы для карыстальніка;

выкарыстанне мультымедыя, відэазапісаў і інш.

9.4. Прэзентацыя рэсурсу павінна быць падрыхтавана з выкарыстаннем сучасных тэхналогій, што дасць магчымасць выкарыстоўваць яе без дадатковай перапрацоўкі. Працы пераможцаў могуць быць рэкамендаваны для ўдзелу ў навукова-практычных бібліятэчных семінарах і канферэнцыях ад Мінскай вобласці.

10. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ:

10.1. Перавага ў ацэнцы аддаецца рэсурсам, у межах якіх праведзены краязнаўчыя даследаванні з далучэннем да іх падлеткаў і моладзі, інфармацыя з віртуальнага кантэнту актыўна выкарыстоўваецца ў правядзенні мерапрыемстваў.

10.2. Вынікі конкурсу падводзяцца на пасяджэнні журы да 15.12.2023.

10.3. Конкурсныя матэрыялы, якія не адпавядаюць патрабаванням ці паступілі пазней названай даты разглядацца не будуць.

10.4. Рашэннем журы вызначаюцца пераможцы ў намінацыі «Лепшы віртуальны рэсурс пра пісьменніка-земляка» з уручэннем дыпломаў 1, 2 і 3 ступені адпаведна.

10.5. За актыўны ўдзел у конкурсе па рашэнні журы могуць уручацца заахвочвальныя дыпломы.

10.6. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца членамі журы, выпіска з пратакола будзе размешчана на сайце Мінскай абласной бібліятэкі. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі, спасылкі на ўсе рэсурсы публічных бібліятэк будуць размешчаны на сайце Мінскай абласной бібліятэкі.

10.7. Інфармацыя аб правядзенні і выніках конкурсу будзе апублікавана ў «Краязнаўчай газеце», размешчана на інфармацыйным сайце Мінскай абласной бібліятэкі.

Да Палажэння

аб парадку правядзення
абласнога конкурсу

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ
абласнога конкурсу
на стварэнне лепшага віртуальнага музея на сайце бібліятэк у рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю»

| | |
|---|---|
| Белавушка Наталія Уладзіміраўна | намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоце дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна» |
| Лаўрык Таццяна Анатольеўна | загадчык аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Вярхоўская Кацярына Дзмітрыеўна | загадчык аддзела чытальных залаў дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Барахоўская Марыя Аляксандраўна | загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Караленка Алена Андрэеўна | вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |

Да Палажэння

аб парадку правядзення
абласнога конкурсу

СКЛАД ЖУРЫ

абласнога конкурсу

на стварэнне лепшага віртуальнага музея на сайце бібліятэк у рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю»

| | |
|---|---|
| Вашчыла Наталія Мікалаеўна | дырэктар дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» – *старшыня журы* |
| Белавушка Наталія Уладзіміраўна | намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоце дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» – *намеснік старшыні* |
| Лаўрык Таццяна Анатольеўна | загадчык аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Барахоўская Марыя Аляксандраўна | загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Вярхоўская Кацярына Дзмітрыеўна | загадчык аддзела чытальных залаў дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Караленка Алена Андрэеўна | вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства дзяржаўнай установы «Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна» |
| Незалежныя эксперты | |
| Солушка Ганна Леанідаўна | галоўны бібліятэкар сектара інфармацыйнай падтрымкі інтэрнэт-партала аддзела суправаджэння інтэрнэт-партала дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» |
| Трус Мікола Валянцінавіч | старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай установы «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат філалагічных навук |

Да Палажэння
аб парадку правядзення абласнога
конкурсу

Аргкамітэту абласнога конкурсу на
стварэнне лепшага віртуальнага музея на
сайце бібліятэк

______________________________________

______________________________________
прозвішча, імя, імя па бацьку (поўнасцю)
кіраўніка рэсурса
______________________________________

______________________________________
месца працы
______________________________________

______________________________________

______________________________________

______________________________________
пасада
______________________________________

______________________________________

______________________________________
кантактная інфармацыя: паштовы адрас,
тэлефон, адрас электроннай пошты

ЗАЯЎКА

Прашу прыняць да разгляду работу
____________________________________________________________

____________________________________________________________
на абласны конкурс на стварэнне лепшага віртуальнага музея на сайце бібліятэк ў рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» ў намінацыі «Лепшы віртуальны рэсурс пра пісьменніка-земляка».

Дата Подпіс Ініцыялы і прозвішча

РАШЭННЕ
пасяджэння
сяброў журы

12 снежня 2023
г.Мінск

Аб выніках абласнога конкурсу на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу на сайце бібліятэкі ў рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю»

Краязнаўства, гісторыка-культурная спадчына з'яўляюцца спрадвечнымі крыніцамі фарміравання нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва. З 15 сакавіка па 15 снежня 2023 года ў рамках абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» праходзіў абласны конкурс на стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка (віртуальнага музея, кабінета і старонкі аўтара) на сайтах публічных бібліятэк Міншчыны. Конкурс быў арганізаваны з мэтай выяўлення і падтрымкі лепшых віртуальных рэсурсаў, створаных для ўшанавання памяці і папулярызацыі творчасці пісьменнікаў-землякоў, прыцягнення ўвагі шырокай аўдыторыі да вывучэння беларускай літаратуры, фарміравання іміджу бібліятэкі і развіцця інфармацыйных рэсурсаў раённых бібліятэк у інтэрнэт-прасторы.

На конкурс былі прадстаўлены 9 прац ад бібліятэк: ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева», ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча», ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча», ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка», ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Труса».

Матэрыялы, якія былі прадстаўлены на абласны конкурс, уключалі: заяўку, інфармацыйную даведку аб віртуальным рэсурсе і прэзентацыю рэсурса ў PowerPoint, якая расказвае пра яго і ўтрымлівае тэкставыя, фота-, відэаматэрыялы.

У склад журы абласнога конкурсу ўваходзілі:

Наталля Вашчыла – старшыня журы, дырэктар ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна»;

Наталля Белавушка – намеснік старшыні, намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоце ДУ «Мінская абласная бібліятэка ім. А.С.Пушкіна»;

Таццяна Лаўрык – загадчык аддзела бібліятэказнаўства ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна»;

Марыя Барахоўская – загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна»;

Кацярына Вярхоўская – загадчык аддзела чытальных залаў ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна»;

Алена Караленка – вядучы бібліятэкар аддзела бібліятэказнаўства ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А.С.Пушкіна».

Незалежныя эксперты ад іншых бібліятэк:

Ганна Солушка – галоўны бібліятэкар сектара інфармацыйнай падтрымкі інтэрнэт-партала аддзела суправаджэння інтэрнэт-партала ДУ «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»;

Мікола Трус – старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў ДУ «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

На пасяджэнні сяброў журы ВЫРАШАНА:

1. Разгледзеўшы конкурсныя матэрыялы, прааналізаваўшы напаўненне кожнага віртуальнага рэсурсу, было прысуджана:

Дыплом 1-й ступені за стварэнне лепшага віртуальнага рэсурсу пра пісьменніка-земляка атрымалі дзве бібліятэкі:

ДУ «Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка» – за віртуальны музей Васіля Віткі «Народжаны пад знакам паэзіі»;

ДУК «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» – за віртуальны кабінет Фёдара Гурыновіча, перапрацаваны і палепшаны за час дзейнасці абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю»;

Дыплом 2-й ступені – ДУК «Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Труса» за стварэнне віртуальнага музея Паўлюка Труса, які папаўняўся і дапрацоўваўся ў 2022–2023 гадах.

Дыплом 3-й ступені атрымалі дзве бібліятэкі: ДУК «Маладзечанская цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» – за рэсурс «Пісьменнік дабрыні і шчырасці: віртуальны музей Янкі Галубовіча» і ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка» – за рэсурс «Віртуальны музей народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча».

Заахвочвальнымі дыпломамі былі адзначаны: ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева» – за ўклад у развіццё літаратурнага краязнаўства («Виртуальный музей Леонида Рашковского»), ДУ «Мінская раённая цэнтральная бібліятэка» – за актыўную працу па папулярызацыі віртуальнага музея Язэпа Пушчы, ДУК «Смалявіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча» – за даследчую працу ў рамках віртуальнага музея Міколы Нікановіча, ДУК «Старадарожская раённая цэнтральная бібліятэка» – за паспяховы старт пры стварэнні віртуальнай старонкі Міхася Парахневіча.

2. Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны дыпломамі і памятнымі прызамі на выніковай нарадзе дырэктароў публічных бібліятэк Мінскай вобласці па выніках працы за 2023 год.

3. Усе прадстаўленыя на конкурс віртуальныя рэсурсы будуць далучаны на сайт ДУ «Мінская абласная бібліятэца імя А.С.Пушкіна» ў раздзел «Краязнаўчы цэнтр» (літаратурнае краязнаўства).

4. Для пераможцаў, якія занялі першае і другое месца, рэкамендавана ў абавязковым парадку далейшая папулярызацыя сваіх рэсурсаў на абласных, рэспубліканскіх і міжнародных бібліятэчных навукова-практычных мерапрыемствах.

Старшыня журы – дырэктар
ДУ «Мінская абласная бібліятэка
імяА.С.Пушкіна» Н.М.Вашчыла

## Спіс рэкамендаванай літаратуры


1. Березкина, Н. Ю. Онлайн-проекты публичных библиотек Беларуси по продвижению книги и чтения / Н. Ю. Березкина // Материалы IX Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», посвященного 100-летию Национальной библиотеки Беларуси : [по теме] Цифровая трансформация библиотек: преемственность и вектор развития», Минск, 15–16 сент. 2022 г. / Нац. б-ка Беларуси ; [сост. В. В. Пшибытко ; под общ. ред. О. Ю. Книжниковой]. – Минск, 2022. – С. 254–258
2. Березкина, Н. Ю. Социокультурная деятельность в режиме онлайн: опыт публичных библиотек Беларуси [Электронный ресурс] / Н. Ю. Березкина // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств [и др.]. – Минск, 2021. – [Вып. 15] : XV Международная научно-практическая конференция, Минск, 13 мая 2021 г. / редкол.: Н. В. Карчевская (пред.) [и др.]. – Режим доступа: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/23851/SOCIOKUL%27TURNAYA%20DEYATEL%27NOST%27%20V%20REZHIME%20ONLAJN.pdf.
3. Борисюк, Е. С. Электронные информационные ресурсы и базы данных собственной генерации Брестской областной библиотеки им. М. Горького: создание и продвижение [Электронный ресурс] / Е. С. Борисюк // Библиотека в XXI веке. Молодежный потенциал в науке и практике : материалы XIV Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 22 февр. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост. Л. А. Авгуль ; ред. М. М. Лис ; редкол.: Л. А. Авгуль (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – Режим доступа: http://library.basnet.by/handle/csl/1182.
4. Виртуальная реальность: [база данных Солигорской районной центральной библиотеки пополнились виртуальным кабинетом Ф. Гуриновича] // Калійшчык Салігорска. – 2023. – 25 авг. (№ 34). – С. 2.
5. Гончар, И. Виртуальный проект как инструмент культурного брендинга территории / И. Гончар // Бібл. свет. – 2022. – № 6. – С. 19–22.
6. Градоўкина, І. У. Папулярызацыя краязнаўчых праектаў і рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сродкамі інтэрнэт-партала (на прыкладзе інтэрнэт-праекта «Па старонках беларускага календара») / І. У. Градоўкіна // Материалы VII Международнага конгресса «Библиотека как феномен культуры». Краеведение и страноведение в сохранении культурного разнообразия, Минск, 21–22 окт. 2020 г. / Нац. б-ка Беларуси ; [сост.: Т. В. Кузьминич, А. А. Суша ; науч. ред. Р. С. Мотульский]. – Минск, 2020. – С. 80–86.
7. Грубник, Я. Интернет-проекты в публичной библиотеке: от идеи к реализации / Я. Грубник // Бібл. свет. – 2023. – № 1. – С. 20–21.
8. Давідоўскі, З. Новы музей Максіма Багдановіча ў Мінску / З. Давідоўскі // Краязн. газ. – 2023. – № 34 (верас.). – С. 4–5.

9. Камлюк, М. А. Віртуальны музей як сродак захавання і папулярызацыі гістарычнай памяці / М. А. Камлюк // Материалы X Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», приуроченного к Году мира и созидания, Минск, 19–20 окт. 2023 г. / Нац. б-ка Беларуси ; [сост. Н. С. Есис]. – Минск, 2023. – С. 270–277.

10. Касцюк, Ю. «Сэрца, дзе ўсёй зямлі трывога... «: вопыт стварэння віртуальнага музея Аркадзя Куляшова / Ю. Касцюк // Бібл. свет. – 2020. – № 2. – С. 10–12.

11. Касцюк, Ю. Сувязь часоў: «Жыліцкі Версаль» у віртуальнай прасторы / Ю. Касцюк // Бібл. свет. – 2021. – № 4. – С. 26–28.

12. Ковальчук, Т. А. История, современное состояние и перспективы развития исследований в области изучения музейных коллекций библиотек [Электронный ресурс] / Т. А. Ковальчук // Библиотека в XXI веке. Вектор развития: рецессия, стагнация или положительная динамика? : материалы XI Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 29 окт. 2019 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; ред. М. М. Лис ; редкол.: Л. А. Авгуль (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2020. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – Режим доступа: http://library.basnet.by/bitstream/csl/862/3/Biblioteka_v_21_veke_vektor_razvitija-3.pdf.

13. Ковальчук, Т. А. Музейные коллекции библиотек в цифровой среде / Т. А. Ковальчук // Матэрыялы XV Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 4–5 крас. 2019 г. / Нац. б-ка Беларуси ; [склад.: Т. А. Сапега, А. А. Суша, К. В. Суша]. – Мінск, 2019. – С. 353–357.

14. Кондратович, А. Б. Виртуальный музей, музейная комната: возможности, этапы создания, перспективы [Электронный ресурс] / А. Б. Кондратович, Т. П. Марчик // Соврем. образование Витебщины. – 2014. – № 4 (6). – Режим доступа: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/5783/1/c14n4p83.pdf.

15. Лаўрык, Т. А. Анлайн-мерапрыемствы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў рамках праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» / Т. А. Лаўрык // Материалы VIII Международного конгресса “Библиотека как феномен культуры” : библиотеки в условиях пандемии: новые возможности, новые решения”, Минск, 21–22 окт. 2021 г. / Нац. б-ка Беларуси ; [сост. А. А. Суша] ; под общ. ред. О. Ю. Книжниковой. – Минск, 2021. – С. 200–206.

16. Лаўрык, Т. А. Віртуальныя праекты і выстаўкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: ад ідэі да новых форм папулярызацыі / Лаўрык Т. А. // Бібл. весн. : [навук. зб. арт.] / Нац. б-ка Беларусі ; [рэдкал. : Р. С. Матульскі (старш.) і інш.]. – Мінск, 2020. – Вып. 12. – С. 204–214.

17. Лаўрык, Т. А. Формы папулярызацыі віртуальных праектаў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (на прыкладзе праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» : да 100-годдзя... / Лаўрык Т. А. // Матэрыялы XV Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 4–5 крас. 2019 г. / Нац. б-

ка Беларуси ; [склад.: Т. А. Сапега, А. А. Суша, К. В. Суша]. – Мінск, 2019. – С. 344–347.

18. Лаўрык, Т. Імідж ствараюць землякі : [падвядзенне вынікаў абл. літ.-краязн. праекту «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» за 2023 год, які рэалізоўвае ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»] / Т. Лаўрык // ЛіМ. – 2024. – 9 лют. – С. 4.

19. Лаўрык, Т. Новыя формы папулярызацыі праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» ва ўмовах пандэміі COVID-19 / Т. Лаўрык // Культура Беларуси: реалии современности : IX Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 45-летию учрежд. образ. «Белорус. гос. ун-т культуры и искусств», Минск, 8 окт. 2020 г. : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; [редкол.: Н. В. Карчевская (пред.). – Минск, 2020. – С. 234–238.

20. Лаўрык, Т. Падвядзенне вынікаў абласнога праекта «Пісьменнікі – ураджэнцы роднага краю» / Т. Лаўрык // Б-ка прапануе. – 2024. – № 3. – С. 38–40. – 1 вокл.

21. Лаўрык, Т. Прэзентацыя віртуальнага музея Язэпа Пушчы на малой радзіме пісьменніка / Т. Лаўрык ; фота М. Камлюк // Краязн. газ. – 2023. – 17 сак. – С. 4.

22. Лаўрык, Т. А. Стварэнне віртуальных рэсурсаў пра пісьменнікаў-землякоў публічнымі бібліятэкамі Мінскай вобласці / Т. А. Лаўрык // Матэрыялы XX Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 18–19 крас. 2024 г. / Нац. б-ка Беларусі ; склад.: Т. У. Карнілава, Г. У. Кірэева, Н. В. Мужыла ; рэдкал.: В. Ф. Гігін (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2024. – С. 286–290.

23. Маляўка, Т. У. «Літаратурны краязнаўчы чэлендж»: інавацыйны праект у лічбавым асяроддзі [Электронный ресурс] / Т. У. Маляўка // Библиотека в XXI веке. Молодежный потенциал в науке и практике : материалы XIV Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 22 февр. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост. Л. А. Авгуль ; ред. М. М. Лис ; редкол.: Л. А. Авгуль (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – Режим доступа: http://library.basnet.by/handle/csl/1182.

24. Панасина, О. П. Виртуальные экспозиции в медийном пространстве. Говорит и показывает библиотека [Электронный ресурс] / О. П. Панасина // Библиотека в XXI веке. Молодежный потенциал в науке и практике : материалы XIV Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 22 февр. 2023 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост. Л. А. Авгуль ; ред. М. М. Лис ; редкол.: Л. А. Авгуль (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – Режим доступа: http://library.basnet.by/handle/csl/1182.

25. Программы и проекты публичных библиотек : требования к созданию и оформ. / Мин. обл. б-ка им. А. С. Пушкина, Отд. библиотековедения ; [сост. Е. Г. Нестеренко]. – Минск, 2018. – 84 с.

26. Рушницкая, И. «Барановичи читающие» как имиджевый информационный ресурс / И. Рушницкая // Бібл. свет. – 2023. – № 3. – С. 26–29.

27. Саенко, Ю. Библиотека в виртуальном пространстве / Ю. Саенко // Бібл. свет. – 2021. − № 2. – С. 13–16.

28. Слонская, Т. Опыт создания виртуальных проектов Национальной библиотеки Беларуси / Т. Слонская // Бібл. свет. – 2021. – № 1. – С. 26–28.

29. Суслова, И. М. Проектная деятельность библиотек: науч.-практ. пособие / И. М. Суслова, З. И. Злотникова. – М. : Гранд Фаир-пресс, 2005. – 175 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

30. Худніцкая, А. Віртуальныя музеі і выставы: актуальныя тэндэнцыі / А. Худніцкая // Родн. слова. – 2019. – № 1. – С. 77–81.

31. Шевцова, Е. А. Виртуальная выставка : мастер-класс / Е. А. Шевцова // Соврем. б-ка. – 2016. – № 3 (63). – С. 30–35.

Метадычныя рэкамендацыі

**Мемарыяльныя віртуальныя музеі на сайтах бібліятэк**

*Складанне, рэдакцыя* *Т. А. Лаўрык*

*Адказны за выпуск* *Т. А. Лаўрык*

Подпісаны да друку 08.05.2024
Тыраж 3 Заказ № 1

Рызограф ДУ «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна»
220005 г. Мінск, вул. Гікалы, 4
e-mail: pushkinlib@gmail.com